Пралетары усіх краёў, злучайцеся!

# ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

№ 107 (3215) Серада, 15-га Мая 1929 г.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

**РАДЫЯ** ... ноччу:

**ПЭЙПІН, 14. Камандуючы нанкінскімі войскамі ў Шаньдуні паведаміў нанкінскі ўрад, што ён затрымаў некалькі цягнікоў са збожжам, якое было закуплена Фынь Юй-сянаўскім гэнэралам Сун Лян-чэнам для войск Фынь Юй-сяна.**

**АПОШНІЯ НАВІНЫ Б. С. С. Р.**

**IX Усебеларускі зьезд саветаў: даклады т. т. Рачыцкага і Баліцкага.**

**Лісток РСІ: аб чыстцы савецкага апарату**

**У 12 вярстох ад Менску здарыўся вялікі лясны пажар.**

БУРНЫЯ СЦЭНЫ Ў ПРУСКІМ ЛЯНДТАГУ

## КРЫВАВАЯ РАСПРАВА САЦ.-ФАШЫСТЫХ У БЭРЛІНЕ

### Толькі эпізод наступленьня рэакцыі на камунізм у міжнародным маштабе

БЭРЛІН, 13. Сёньня ў прускім ляндтагу разыграліся бурныя сцэны. Абгаворвалася прапанова, унесеная камуністымі пасьля першамайскіх падзей аб звальненьні з пасады бэрлінскага паліцэй-прэзыдэнта Дэргібэля, а таксама віноўных у крывапраліцьці паліцэйскіх афіцэраў і чыноўнікаў, аб адмене забароны вулічных дэманстрацый і забароны «Ротэ Фанэ».

Паяўленьне прускага міністра ўнутраных спраў, сацыял дэмакрата Гржэзінскага, камуністычныя дэпутаты сустрэлі выкрыкамі «кровопийца», «ищейка». З матывіроўкай камуністычнай прапановы выступіў тав. Касьпэр. У сваёй прамове ён заявіў:

«Кроў, што пралілася на вуліцах Бэрліну, падае на сацыял-дэмакратаў і рэфармісцкіх лідэраў прафэсыянальных саюзаў, якія займаліся цкаваньнем. Паліцыя вяла сябе так, як быццам яна знаходзілася ў варожай краіне. Забарона вулічных дэманстрацый была зроблена з-за страху страты прэстыжу сац.-дэмакратыяй, з баязьні перад нарастаньнем камуністычнага руху. **Бэрлінскае выступленьне сацыял-дэмакратыі прадстаўляе сабой эпізод наступленьня рэакцыі на камунізм у міжнародным маштабе.** Сацыял-дэмакратам ня ўдасца зьняць з сябе адказнасьць за крывавыя падзеі ў першыя дні мая. Ілжывыя паведамленьні сацыял-дэмакратычнага друку аб «дырэктывах Камінтэрну»—горшыя ўзоры прапаганды ў часе вайны. Бэрлінская паліцыя запляміла сябе крывёю людзей, якія ня прымалі ніякага ўдзелу ў першамайскіх падзеях. **Сапраўдныя віноўнікі крывапраліцьця зараз знаходзяцца у міністэрстве ўнутраных спраў, у паліцэй-прэзыдыуме і ў цэнтральным камітэце с.-д. партыі.** Нямецкая сацыял-дэмакратыя расчышчае шлях фашызму».

Пасьля прамовы Касьпэра на трыбуне паявіўся Гржэзінскі. Зьяўленьне яго на трыбуне сустракаецца камдэпутатамі крыкамі абурэньня, якія працягваліся хвілін дзесяць. Як ні стараўся старшыня адняўць цішыню, Гржэзінскі так і ня мог пачаць прамову. Камуністычныя дэпутаты сабраліся каля трыбуны і ў працягу гадзіны ня перасталі перарываць Гржэзінскага крыкамі пратэсту.

Старшыня тры разы абвяшчаў пасяджэньне закрытым, надарэмна заклікаў камуністычных дэпутатаў да парадку і, нарэшце, выключыў 2-х—лідэра прускага аддзелу чырвонага саюзу франтавікоў Ендрэцкага на 20 пасяджэньняў і Абэндзіка—на 8 пасяджэньняў.

Гржэзінскі змог пачаць сваю прамову толькі пасьля таго, як камуністычны дэпутат Абэль запрапанаваў камуністычным дэпутатам пакінуць залю пасяджэньняў. За выключэньнем сваіх прамоўцаў камуністычная фракцыя пакінула залю пасяджэньня поўнасьцю пад пяньне «Інтэрнацыяналу». (ТАСС).

### Зэвэрынг выкручваецца

БЭРЛІН, 13. Адказваючы на запытань не камуністычнага дэпутата Штэкэра, нямецкі міністр унутраных спраў Зэвэрынг заявіў на пасяджэньні бюджэтнай камісіі:

«Ні нямецкі ўрад, ні міністар унутраных спраў не падтрымлівалі ніякай сувязі з Арловым, ні з кім-небудзь з яго людзей. Гэта група не атрымала ні гроша з урадавых сродкаў. Што датычыцца цьверджаньня, што камісарыят грамадзкага парадку падтрымліваў сувязь з людзьмі Арлова, дык я сам ня ў стане да гэтага часу ўявіць сябе ясны малюнак ва ўсіх разгалінаваньнях групы Арлова і таму на гэта пытаньне не магу адказаць». (ТАСС).

### Заклік да ўдзелу ў зборы чырвоных франтавікоў

БЭРЛІН, 12. Акруговыя камітэты арганізацыі нямецкай кампартыі ў вобласьцях Ніжняга Рэйну, Сярэдняга Рэйну і Рурскай вобласьці заклікаюць рабочых Заходняй Нямеччыны прыняць удзел ў зборы чырвоных франтавікоў, які адбудзецца ў Эсэне 19-га мая.

Як ужо паведамлялася, збор чырвоных франтавікоў Паўднёва-Нямецкіх акруг адбудзецца ў Штутгарце. Акрамя таго ў тыя-жа дні 19-20-га мая дэманстрацыі адбудуцца ў Хэмніцы (Саксонія).

## БАРАЦЬБА Ў АЎГАНІСТАНЕ

### НЕЗАДАВАЛЕНЬНЕ СЯЛЯН БАЧЭ-САКАО

### *Узмоцненьне тэрору*

**ТЭРМЕЗ, 13. Ва ўсіх раёнах паўночнай правінцыі Аўганістану ажывілася дзейнасьць прыхільнікаў Аманулы. Загнаныя ў падполье тэрорам Бачэ-Сакао, прыхільнікі Аманулы праяўляюць усё большую актыўнасьць, рыхтуючы перавароты ў яго карысьць. Гарадзкое насельніцтва, яное значна пацярпела ад грамадзянскай вайны і парушэньня гандлёвай сувязі з Савецкім Саюзам, адкрыта выказвае незадавольненьне існуючым рэжымам. Адзначаецца таксама рэзкая зьмена адносін да Кабульскага ўраду з боку сялянства, яное церпіць ад грабежніцкіх налётаў і разгулу басмацкіх шаек. Мясцовая ўлада ў зьвязку з гэтым узмацняе тэрор.** (ТАСС)

### ШЫРОКАЯ РАБОТА АНГЕЛЬСКІХ АГЭНТАЎ

**КУШКА, 13. Тут атрыманы весткі, што ангельскія агенты разгарнулі шырокую работу па разлажэньні пляменнаў Усходняй і Паўднёвай вобласьцей Аўганістану, якія рыхтуюцца да паходу на Кабул. Асабліва актыўнасьць праяўляе мула Надыбараб з Багдаду, адзін з самых вопытных ангельскіх шпіёнаў.** (ТАСС).

### ЗАЯВА БАСМАЦКАГА ПРАВАДЫРА

**ДЗЮШАМБЭ, 13. Басмацкі правадыр Фузайлі, разьбіты часьцямі Чырвонай армії, перад бегствам заграніцу пасьпеў сабраць у сваім родным кішлаку мітынг, на якім выклаў усю праграму дзеяньняў. Максул Фузайлі заявіў, што яго шайка зьяўляецца „перадавым атрадам вялізнай армії, якая наніроўваецца ў Таджыкістан» на чале з былым бухарскім эмірам Ібрагім-Бэкам.** (ТАСС).

## Прамысловы крызіс у Польшчы пашыраецца

### Бурны зьезд „Стрэльца“ ў Варшаве

### Кіраўніцтва „Стрэльцом“ пераходзіць у руні палкоўніцкай групы.

ВАРШАВА, 13. У нядзелю ў Варшаве адбыўся зьезд буйнейшай ваеннай арганізацыі пілсудчыкаў «Стралец», якая аб'ядная 300 тысяч чалавек. Гэты зьезд, зьяўляецца вельмі характэрным для ўзаемаадносін, існуючых у лягеры пілсудчыкаў пасьля майскага перавароту.

Палкоўніцкая група яшчэ да зьезду прымала ўсе меры да таго,каб захапіць «Стралец» у свае рукі. Для гэтай мэты палкоўніцкая група ўсямерна дабівалася зьмяшчэньня старшыні галоўнага праўленьня Длускага і галоўнага камэнданта «Стральца»—Кэжкоўскага. Як Длускі, так і Кэжкоўскі далучаюцца да так званай дэмакратычнай групы пілсудчыкаў.

На апошнім пасяджэньні «Стральца» паявіўся генэрал Рыдз-Сьміглы, які ад імя пілсудчыкаў заявіў, што Длускі і Кэжкоўскі не павінны быць абраны.

Ня так лёгка, аднак, аказалася ажыцьцявіць гэта на зьезьдзе. Зьезд меў вельмі бурны характар . Большасьць дэлегатаў зазначала, што яны разглядаюць прапанову палкоўніцкай групы, як карную экспэдыцыю супроць «Стральца». Далей дэлегаты падкрэсьлівалі, што супроць Кэжкоўскага выступаюць прымазаўшыяся да пілсудчыкаў удзельнік 4-й брыгады. З прычыны ўсіх гэтых спрэчак, прэзыдэнт рэспублікі адмовіўся ад удзелу ў зьезьдзе. Ня гледзячы на націск, большасьць зьезду ўхваліла рэзалюцыю, якая выказвае давер'е Кэжкоўскаму і прапануе яму застацца на займаемым пасту.

Тады выступіў Рыдз-Сьміглы і адкрыта заявіў, што Пілсудзкі не жадае бачыць на гэтым пасту Кэжкоўскага і высоўвае ў якасьці кандыдата на гэты пост былога камэнданта Варшавы генэрала Рожэна. Кандыдатам-жа на пост старшыні галоўнага праўленьня прапануецца Сэрашэўскі. Пытаньне было перададзена ў камісію, якая прыняла пастанову рабіць выбары адкрытым галасаваньнем. Гэты мэтад даў пажаданую большасьць для кандыдатаў, высунутых Рыдз-Сьміглы.

Пасьля выбараў раздаліся воклічы «Вы сябе прадалі», некаторыя ўдзельнікі зьезду кідаліся на другіх з кулакамі. Усё-ж у канчатковым выніку палкоўніцкая група дабілася свайго (ТАСС).

### Сумныя пэрспэктывы ўсепольскай гаспадарчай выстаўкі

ВАРШАВА, 6. 16-га мая ў Пазнані адкрываецца ўсепольская выстаўка народнае гаспадаркі.

Цяжкі эканамічны крызіс, які ахапіў усю краіну, не абяцае, зразумела, выстаўцы ніякіх посьпехаў. Гандлёва-прамысловыя колы Польшчы добра разумеюць гэта і каб уніканць канфузу, адмяняюць рад мерапрыемстваў дэманстрацыйнага характару.

Характэрным у гэтых адносінах зьяўляецца новая пастанова прэзыдыуму рады аб'яднаньня польскіх камэрсантаў адносна зьезду рады аб'яднаньня ў Пазнані, які у свой час рашана было прыстасаваць да моманту адкрыцьця выстаўкі. Задачай гэтага зьезду павінна было зьявіцца абмеркаваньне агульных камэрцыйных пытаньняў, якія адпавядалі-б урачыстым настроям і такому важнаму факту, як адкрыцьцё усепольскай гаспадарчай выстаўкі.

Зараз прэзыдыум рады аб'яднаньня знайшоў, што ажыцьцяўленьне такой патрыятычнай дэманстрацыі камэрсантаў ня зусім падыходзіць у момант цяжкага гаспадарчага крызісу. Папершае, зараз радзе аб'яднаньня трэба заняцца важнейшымі практычнымі пытаньнямі не ўрачыстага характару. Падругое, становішча польскага гандлю настолькі крытычнае, што зьезду прыдзецца прымаць даволі рэзкія рэзалюцыі, у самай рэзкай форме крытыкаваць эканамічную палітыку ўраду і ня менш рэзка патрабаваць рэформы і падатковых палёгкаў. Такі тон зьезду, па думцы прэзыдыуму аб'яднаньня польскіх камэрсантаў, ніякім чынам ня можа дапамагаць посьпеху выстаўкі. З гэтае прычыны пастаноўлена зьезд адмяніць.

***

**ВАРШАВА, 13. Згортваньне работы ў тэкстыльнай прамысловасьці ідзе поўным ходам. У Чэнстахове звольнена 1.200 рабочых. У Белхатаве ўсе фабрыкі спынілі работу. У Пабіяніцах і Згэржы фабрыкі працуюць тры-чатыры дні ў тыдзень. Згортваньне работы ў тэкстыльнай прамысловасьці ахоплівае ня толькі Лодзінскі раён, але і іншыя. У Бэльску (Верхняя Сілезія) скарочана 2.000 рабочых. Зарэгістравана 100 новых выпадкаў самазабойства на глебе голаду і беспрацоўя. (ТАСС).**

### РАЗГОН ДВОХ ПРАФСАЮЗАЎ

ВАРШАВА, 6. Прафсаюзы рабочых краўцоў і прадаўцоў зьвярнуліся да гаспадароў з патрабаваньнем 20 проц. павялічэньня зарплаты і звальненьня рабочых толькі са згоды прафсаюзаў. Гаспадары згадзіліся толькі на 10 проц. павялічэньня зарплаты і адхілілі патрабаваньне аб звальненьні рабочых са згоды саюзаў. Умяшаньне інспэктара працы не дало вынікаў. Пасьля гэтага камісарыят ураду зачыніў абодвы прафсаюзы і апячатаў іх памяшканьні («Жэчп.»)

### КАТАРГА ЗА НАПАД НА ПРАВАКАТАРА

ВАРШАВА, 7. У мінулым годзе перад 1-м мая ў Варшаве вяліся масавыя арышты. У рабочых колах зьявілася падазрэньне, што шмат людзей было арыштавана, дзякуючы даносам нейкага М. Сосны. Праз нейкі час адбыўся замах на Сосну, які быў паранены. Сосна заявіў аб нападзе ў паліцыю з зазначэньнем прозьвішчаў асоб, якія па яго думцы—рабілі на яго замах.

Варшаўскі акруговы суд, разгледзеўшы гэтую справу, засудзіў: Р. Вайсман, Р. Розэнфэльда, М. Гальпэрна, В. Зднніка і Ш. Русіна на 4 гады катаргі, Л. Эсьсіга—на 5 год турмы. Апэляцыйны суд па скарзе пракурора павялічыў усім кару на 1 год турмы. («Роб.»).

### РАЗГОН ТРОХ ДЭМАНСТРАЦЫЙ

ВАРШАВА, 9. У Варшаве паліцыя разагнаны тры рабочыя дэманстрацыі пратэсту супроць зьверстваў Бэрлінскі паліцыі першая мая. Адна дэманстрацыя адбывалася перад памяшканьнем «Роботніка», другая—перад «Бундам» і трэцяя—перад рэдакцыяй яўрэйскае газэты «Фолксэйтунг». («Жэчп.»).

### КАНФІСКАЦЫІ

ВАРШАВА, 9. Варшаўскім камісарыятам ураду канфіскаваны № 123 газэты «АБЦ» і № 16 «Пляцувкі» за 5 мая. («Жэчп.»).

Канфіскавана «Газэта Варшаўска» за 5-та мая за ўступны артыкул праф. Рыбарскага. («Роб.»).

У Каровіцах канфіскавана «Полёнія» за 5 мая за зьмяшчэньне адкрытага лісту дэпутата Карфантага да прэзыдэнта Польшчы аб становішчы ў Верхняй Сілезіі. («Роб.»).

Канфіскаваны № 118 «Газэты Варшаўскай» за артыкул у гаспадарчым аддзеле пад назвай: «Шкодная сыстэма». («Г. В.» 119.).

***

# IX Усебеларускі зьезд Саветаў

## Сацыялістычная перабудова сельскае гаспадаркі

### Асноўная ўвага калектывізацыі, мэханізацыі, агранамічным мерапрыемствам

### (З дакладу тав. РАЧЫЦКАГА)

Сяляне Беларусі ў выніку Кастрычніцкае рэвалюцыі атрымалі ў працоўнае карыстаньне землі ад былых памешчыкаў і іншыя землі ў колькасьці 2.381.500 гэктараў. У выніку размяжоўнарадкаваньня таксама маем пекаторае перамяшчэньне зямельнае плошчы паміж паасобнымі сацыяльнымі групамі вёскі. Да рэвалюцыі па тэрыторыі сучаснай Беларусі было 9,9 проц. беспасеўных гаспадарак. У канцы 1928 году гэты процант зьніжыўся да 1,4 проц. Пасеўная плошча з 1916 да 1927 г. павялічылася з 28,8 проц. Мы маем таксама значнае павялічэньне колькасьці жывёлы—на 37 проц. у параўнаньні на буйную жывёлу. Гэта гаворыць за тое, што сельская гаспадарка БССР усё больш набывае інтэнсіўныя формы.

Аднак, нашы патрэбнасьці за гады рэвалюцыі значна вырасьлі. Прамысловасьць, уцягваючы ўсё большыя і большыя кадры рабочых, прад'яўляе ўсё большы і большы попыт на сырэц. Вёска стала спажываць больш, чым спачатку пасьля рэвалюцыі. Сельская гаспадарка ня можа задаволіць вырасшыя патрэбнасьці насельніцтва, такога становішча далей цярпець нельга. Трэба павысіць ураджайнасьць і гэтым самым таварнасьць сельскае гаспадаркі.

Што прадугледжвае пяцігодка для выкананьня задач, якія высунуты перад сельска-гаспадаркай Беларусі?

За пяцігодзьдзе намечана земляўпарадкаваць у асноўным усю плошчу, а ў ільна-прамысловых раёнах закончыць у два гады. Ці азначае гэта, што мы гэту справу скончым у пяць год? Не. Пры тым калектыўным руху, які мы маем, за пяць год усёй зямляўпарадкаваўчай працы ня скончым. Сёньня ўжо прыходзяць з некаторых вёсак хутарэ і кажуць: «пераходзім на іншыя формы, нам не падыходзіць Сталыпінская форма». З гэтага вынікае, што скончыць зямляўпарадкаваньне мы ня можам пакуль не аб'яднаем асноўную масу сялянскіх двароў у калектыўныя формы.

На гэту справу пуцігадовым плянам вызначаецца 15 мільён. руб., па бюджэце і 1.500 тыс. доўгатэрміновага крэдыту на крэдытаваньне выходзячых з маламоцных гаспадарак членаў сям'і.

За пяць год намячаецца мэліяраваць каля 540.000 гэктараў, з якіх пойдзе ў лясны фонд 140.000 гэктараў, асвоена мэліярацыйнымі таварыствамі 200.000 гэкт., у лугавы фонд—25.000 гэкт. і ў калёнізацыйны фонд—100.000 гэктараў.

На гэтую работу прызначаецца 64 мільёны руб., з іх 19 мільён. руб. будзе ўкладзена сродкаў насельніцтва і 42.800.000 руб. дзяржаўных сродкаў.

Акрамя таго, на абсталяваньне саўгасаў, якія будуць арганізаваны на гэтых фондах, асігнуецца 10.000.000 руб. і для сялян, якія будуць асядаць у калгасах, доўгатэрміновага крэдыту—4.200.000 р.

На лініі ўзмацненьня існуючых саўгасаў намячаем арганізаваць 12 новых на калёнізацыйных фондах. Намечана арганізацыя саўгасаў таксама на нявыгодных землях.

На фінансаваньне ўсіх саўгасаў мяркуецца за пяць год выдзеліць 40 мільёнаў руб. Калгасаў у 1928 годзе мы мелі 994, за 5 год колькасьць іх будзе даведзена да 4.556. Яны будуць займаць плошчу ў 756.600 гэкт. да канца пяцігодкі супроць 94.400 у 1927-28 г.

Удзельная вага аграмаджанага сэктару да канца пяцігодкі (саўгасаў і калгасаў) складзе 12 проц.

У калгасы за пяць год мяркуецца завезьці 1.400 новых трактараў, мэханізаваць апрацоўку зямлі на 40 проц., замест сучасных 12,6 проц. Мяркуецца мэханізаваць уборку на 80 проц.

Вялікае значэньне для ўздыму сельскай гаспадаркі будуць мець мерапрыемствы, як ужываньне гатункавага насеньня, штучнага ўгнаеньня і машыназабесьпячэньне. Да канца 32-33 году мы намячаем стварыць дзяржаўны насенны фонд у такой колькасьці, якою можна было-б засеяць каля 45-50 проц. усяе плошчы.

Сельска-гаспадарчага інвэнтару мяркуецца купіць за пяць год на 71.122.000 руб. (сюды ўваходзяць 2.300 трактараў і 105 фрэз з адпаведнай колькасьцю прычэпных прылад).

Штучнага ўгнаеньня будзе завезена 904 тыс. тон для ўгнаеньня плошчы ў 1.367 тыс. гэктараў. Заваёўваць глебы мяркуецца 250 тыс. гэкт. на што патрэбна 750 тыс. тон.

Мяркуецца павялічыць плошчу на 6,6 проц., прычым плошча пад пасевы павінна павысіцца супроць сучаснай на 15 проц. Намечаны прыкладна прырост пахаці на 300.000 гэктараў.

Ці зьяўляецца гэта рэальным? Лічбы гаворыць за тое, што гэта магчымa.

Пяцігодка намячае павысіць кармавы балянс на 65,8 проц. Гэта дасьць магчымасьць на многа павялічыць статак: коняй—на 10 проц., буйной рагатай жывёлы—на 31,1 проц., сьвіней—на 41,7 проц., авечак—на 8,2 проц.

Валавая-ж прадукцыя ўсёй сельскай гаспадаркі Беларусі ўзрастае к канцу пяцігодкі на 59,1 проц. Таварная частка яе павялічыцца на 17,2 проц.

Самае галоўнае—гэта мабілізаваць працоўныя масы для ажыцьцяўленьня задач, якія ставіць перад намі пяцігадовы плян. Кіраўніцтва гэтымі масамі забесьпечана, яно знаходзіцца ў добрых руках камуністычнае партыі. Гэта гарантуе, што мы пяцігадовы плян выканаем.

## На шляхох культурнай рэвалюцыі

### Скончыць увядзеньне ўсеагульнага навучаньня.—Зьменшыць расчыненьне культурных „ножніц".—Прафэсыянальную асьвету—у масы

### (З дакладу тав. БАЛІЦКАГА)

Асноўныя задачы культурнага будаўніцтва—ўсеагульнае абавязковае навучаньне, ліквідацыя няпісьменнасьці сярод дарослых і перароскаў, падрыхтоўка кваліфікаванай рабочай сілы і спэцыялістых, навукова-дасьледчая работа і масавая палітасьветная работа. Пытаньне ўсеагульнага абавязковага навучаньня зьяўляецца найбольш актуальным у пяцігадовым пляне культурнага будаўніцтва. У нас вялікая колькасьць дзяцей застаецца па-за школаю. Пяцігодка прадугледжвае ахват дзяцей ад 8 да 11 год школамі на 100 проц. Гэта патрабуе вялікіх затрат. Мы думаем за пяць год павялічыць колькасьць школ на 68 проц. Кошт угрыманьня і навучаньня кожнага вучня з 18 руб. 40 к., якія мы выдаткуем цяпер, будзе даведзены да 36 р. 80 к. За пяцігодзьдзе будзе пабудавана 2.289 школ.

Пяцігодка прадугледжвае затраты на правядзеньне ўсеагульнага абавязковага навучаньня ў суме 105,5 міл. руб. Мы гэтую суму здолеем пакрыць толькі з дапамогаю Саюзу, і пяцігодка гэта прадугледжвае. Нам прыдзецца прасіць у саюзнага ўраду 45 міл. руб. на гэтую справу.

Усеагульнае абавязковае навучаньне мы будзем праводзіць на базе чатырохгодкі. Адукацыя гэта вельмі нізкая, але на большую мы пакуль што ня ў стане пайсьці. У прынцыпе мы за навучаньне на базе сямігодкі. Па меры магчымасьці пашыраем сетку сямігадовых школ. Трэба сказаць, што і сямігодак у нас адносна больш, чым у іншых рэспубліках СССР. Але вёска адстае ад гораду. Тут мы маем паміж горадам і вёскай значнае расчыненьне «культурных ножніц». Задача пяцігодкі заключаецца ў тым, каб расчыненьне ножніц зьменшыць. Мы запраектавалі стыпэндыі для сямігодак у суме 300.000 рублёў у апошні год пяцігодкі замест 50.000 руб. сёлета.

Мы праектуем пашырыць сетку школ для дарослых і вячэрніх школ для малапісьменных. Пяцігодкай устанаўляецца прыкладна адна школа для дарослых на два сельсаветы. Мы паставілі сабе мэтай, каб у канцы пяцігодзьдзя ня было ніводнага няпісьменнага ва ўзросьце да 35 год.

Пяцігадовы плян разьвіцця культурнага будаўніцтва прадугледжвае значнае пашырэньне прафэсыянальнае асьветы, колькасьць прафэсыянальных школ павялічыцца да 53 замест 34, а колькасьць фабзавучаў—да 35 замест 13. Сетка курсаў, па якіх навучаюць розным спэцыяльнасьцям, будзе пашырана з 39 адзінак да 303. Сельска-гаспадарчыя курсы прапусьцяць каля 200.000 сялян.

Да тых 30 тэхнікумаў, якія ў нас ёсьць, думаем дадаць яшчэ сем. У канцы пяцігодзьдзя будзе яшчэ адна ВНУ. Але, ня гледзячы на такое вялікае пашырэньне сеткі прафэсыянальнае асьветы, к канцу пяцігодзьдзя яшчэ вялікім будзе недахват інжынэраў-будаўнікоў, хэмікаў і інжынэраў-мэханікаў.

Для сельскае гаспадаркі таксама ня хопіць спэцыялістых. Прыдзецца запрашаць спэцыялістых з другіх саюзных рэспублік.

Плян падрыхтоўкі спэцыялістых для сельскае гаспадаркі ўвязваецца з патрэбамі калектывізацыі і індустрыялізацыі сельскае гаспадаркі.

Пяцігодка намячае арганізацыю стыпэндый для пэўных катэгорый вучняў, што навучаюцца ў ВНУ Саюзу. Ад іх будзем браць абавязацельствы па скончэньні навучальнае ўстановы прыяжджаць на работу ў Беларусь.

Пяцігодка намячае вялікае пашырэньне навукова-дасьледчай работы ў нашых вышэйшых навучальных установах і ўзмацненьне палітасьветнай работы. За пяцігодзьдзе будзе адкрыта 190 новых хат-чытальнь з такім разьлікам, каб адна чытальня магла абслужыць два сельсаветы. Для чытальнь пабудуем сто спэцыяльных дамоў. Павялічыцца таксама колькасьць бібліятэк і клюбаў—на 9 проц. і 25 проц. На партыйную асьвету за пяцігодзьдзе будзе адпушчана 11.689 тыс. руб.

Пяцігодка прадугледжвае рост зарплаты выкладчыкаў трохгодак, дашкольных устаноў і работнікаў хат-чытальнь—на 61 проц. Заработак выкладчыка тэхнікуму і рабфаку павялічыцца на 55 проц., а заработак навуковага работніка—на 24 проц.

Усе пляны па сацыяльна-культурным сэктары, як і на гаспадарчым будаўніцтве складзены з вялікай напружанасьцю. Патрэбна вялізарная энэргія самых шырокіх колаў працоўных мас, каб гэты плян быў выканан на ўсе 100 проц. Трэба выклікаць гэту энэргію. Неабходна ўзьнімць рэвалюцыйны энтузіязм у працы так, як мы з рэвалюцыйным энтузіязмам змагаліся на франтох грамадзянскай вайны. Бо тут такеама фронт і фронт яшчэ больш складаны, больш дяжкі, чым фронт грамадзянскай барацьбы. І калі гэты рэвалюцыйны энтузіязм у працы будзе, калі мы ўздымем усіх на актыўную творчую працу, мы пераможам на фронце гаспадарчым і культурным таксама, як пераможам на фронце грамадзянскай вайны.

## Спрэчкі па дакладах аб пяцігодцы

### Пяцігодку трэба прасунуць у шырокія масы.—Падрыхтоўка кадраў—адна з важнейшых задач — Трэба больш скарыстаць прыродныя багацьці краіны

**Тав. Стракоўскі.** — Перад намі стаіць задача—больш вывучаць Беларусь. Навуковыя досьледы, досьледы глебавыя павінны быць асабліва выпуклены ў нашай практычнай працы. Гэта дасьць магчымасьць больш пасьпяхова прасоўвацца па шляху сацыялізму.

Наступная заўвага—гэта пытаньне аб кадрах. Задача перакваліфікацыі і перападрыхтоўкі рабочай сілы павінна быць пастаўлена, як галоўная задача ў нашай прамысловасьці.

**Тав. Лук'янчык.**—Пяцігодку трэба шырока прасунуць на мясцы для азнаямленьня з ёю сялянскіх мас. Працоўныя масы павінны вельмі шляхі разьвіцьця нашай народнай гаспадаркі.

**Тав. Мацыеўская.**—Сетка школ на вёсцы зусім рэдкая. Ад гэтага церпіць беднота. Яна ня можа пасылаць сваіх дзяцей у далёкія школы, бо няма ва што іх апрануць. Больш увагі вясковай беднаце.

**Тав. Бэйлін.**—За 5 год мы павінны будзем перасяліць, згодна пляну, некалькі соцень тысяч насельніцтва з Беларусі ў іншыя раёны саюзу: Далёкі Ўсход, Сібір, Урал і інш. Для таго, каб работа прайшла добра, трэба падвесьці некаторыя вынікі праробленай працы. Мы да гэтага часу ня ведаем, як упарадкуюцца тыя перасяленцы, якія выехалі з Беларусі, як яны там крэдытуюцца, якія формы сельскай гаспадаркі там вядуць.

Надзвычайна важнае палітычнае і эканамічнае значэньне мае пытаньне аб упарадкаваньні мястэчак. Але выканкомы не ўдзяляюць гэтаму належнай увагі. Трэба пракаментаваць, як на мясцох праводзяцца дырэктывы ўраду аб упарадкаваньні мястэчак.

**Тав. Барсукоў** (Мазыр). — На маёй думцы, Мазыршчына ў пяцігодцы абойдзена. Вось, напрыклад, толькі ў апошнія часы была вызначана арыентовачна пабудова ў Мазырскай акрузе фабрыкі вагалаў. Ня гледзячы на тое, што наша акруга па сваёй лясістасьці стаіць амаль што на першым месцы, у нас зусім не вызначаецца разьвіцьцё дрэваапрацоўчай прамысловасьці. Трэба даць магчымасьць Мазыршчыне вылезьці з таго запаралага становішча, у якім яна знаходзіцца.

**Т. Дубіна.** Трэба паставіць пытаньне аб тым, каб паміж сельска-гаспадарчай каапэрацыяй і нашай прамысловасьцю стварыць больш правільныя ўзаемаадносіны, каб наша прамысловасьць больш дапасавала свае пляны да абслугоўваньня сельскай гаспадаркі. Мы, напрыклад, да гэтага часу прымушаны выпісваць з-за межаў самыя дробязі—малочны івэнтар, пасудак і г. д.

У пяцігодцы малое месца адведзена вырабу саматужным шляхам будаўнічых матар'ялаў. У нас ёсьць цэлая сетка агнятрывалых таварыстваў, якімі ніхто ня кіруе.

**Т. Бонч-Асмалоўскі.**—Задача пяцігадовага пляну—як мага больш пашырыць калектывізацыю сельскай гаспадаркі. Калектывізацыю трэба будзе праводзіць такім чынам, каб даць у рукі калектываў адразу вялікія тэхнічныя сродкі, каб стварыць пад калектыў адпаведную тэхнічную базу.

**Т. Воўк.** Трэба спыніць параднае будаўніцтва. Па Барысаве закладаецца дом саветаў у той час, калі больніца і школа яшчэ ня скончаны.

Каб зьнішчыць саху пяцігодка павінна прадугледзець павялічэньне выпуску патрэбных плугоў.

**Праф. Пічэта.** Каб нашы навуковыя сілы маглі выконваць тое, што ад іх патрабуе савецкая ўлада і партыя, трэба рэканструяваць становішча выкладчыка ў вышэйшай школе і даць яму магчымасьць ня толькі выкладаць ва універсытэце, а таксама і заняцца навукай.

**Т. Алейнікаў.** Тав. Карп гаварыў аб упадачных настроях у некаторых спэцыялістых. Я вельмі шкадую, што т. Карп не сказаў аб энтузіязьме іншай групы тэхнікаў, аб энтузіязьме тых спэцыялістых, якія хочуць выканаць гэтую пяцігодку.

## Дзеньнік зьезду

○ Учора на ранішнім пасяджэньні скончыліся спрэчкі па дакладу т. Ягорава аб становішчы Чырвонай арміі.

○ На гэтым жа пасяджэньні т. Ягораў выступіў з заключным словам.

○ Днём працавалі камісіі па выпрацоўцы рэзалюцый.

○ Сёньня раніцай зьезд будзе прымаць рэзалюцыі па ўсіх заслуханых дакладах і абярэ ЦВК БССР

# ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

## ПАСТАНОВЫ XVI ПАРТКАНФЭРЭНЦЫІ—У ЖЫЦЬЦЁ

### Ні на мінуту не паслабляць барацьбы з правымі і прымірэнцамі

## Пастановы XVI партканфэрэнцыі—у масы

### Бязьлітасны ўдар па правых і прымірэнцах

**7-га мая адбыўся сход актыву Бабруйскай акруговай арганізацыі КП(б)Б. Сход заслухаў даклад сакратара Бабруйскага АК КП(б)Б т. Грысэвіча аб выніках XVI партканфэрэнцыі. Сход цалкам і поўнасьцю ўхваліў усе пастановы канфэрэнцыі і далучыўся да іх. Сход заклікаў арганізацыю да яшчэ большай барацьбы за генэральную лінію партыі, супроць усіх панінёраў, што капітулююць перад дробнабуржуазнай стыхіяй.**

**Ва ўхваленай рэзалюцыі сход даручыў АК, гаркому і ўсім райкомам распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па бывучэньні арганізацыяй пастаноў XVI партканфэрэнцыі і правядзеньні іх у жыцьцё.**

**Сход абавязаў усе парт'ячэйкі павесьці шырокую работу па папулярызацыі пастаноў XVI партканфэрэнцыі сярод рабочых, батракоў, беднаты і батрацтва.**

## Рашуча змагацца супроць правага ўхілу і прымірэнцтва

**Заслухаўшы даклад тав. Нэйланда аб выніках XVI партканфэрэнцыі, агульны сход Магілёўскай гарадзкой арганізацыі КП(б)Б цалкам і поўнасьцю ўхваляе пастановы канфэрэнцыі і далучаецца да іх.**

**—Сход падкрэсьлівае, што правы ўхіл у радох нашае партыі і прымірэнчыя адносіны да яго зьяўляюцца галоўнай небясьпекай у сучасны момант, як ухіл, які аб'ектыўна адлюстроўвае настрої дробна-буржуазных, нэпманскіх элемэнтаў.**

**— Выкананьне вызначанага канфэрэнцыяй пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва будзе забясьпечана толькі пры ўмовах поўнага адзінства радоў нашае партыі.**

**— Сход заяўляе аб сваёй гатоўнасьці рашуча змагацца з правым ухілам і прымірэнцтвам, завастрыць клясавую чуласьць у практычнай рабоце і прыняць усе захады да ажыцьцяўленьня пастаноў XVI партканфэрэнцыі.**

**— Сход даручае гаркому КП(б)Б распрацаваць мерапрыемствы па вывучэньні пастаноў XVI партканфэрэнцыі ва ўсёй партарганізацыі і папулярызацыі гэтых пастаноў сярод камсамольцаў і беспартыйных рабочых.**

## Абгаварыць склад праверачных камісій

Магілеўская АКК КП(б)Б высунула ў склад праверачных камісій па чыстцы партыі па Магілеўскай арганізацыі КП(б)Б наступных таварышоў: 1) **Сыпрын**—парстаж з 1920 г., рабочы; 2) **Жмойдзік, У.**—партстаж з 1919 г., рабочы; 3) **Габрыловіч**—з 1918 г., рабочы; 4) **Шыцік, С.**—з 1917 г., рабочы; 5) **Піскуновіч**—з 1918 г., рабочы; 6) **Пятрусёў, П.**—з 1917 г.; 7) **Юрэцкі, Н. І.**—з 1919 г., рабочы; 8) **Валковіч**—з 1919 г., рабочы; 9) **Шукальскі**—з 1917 г., рабочы; 10) **Німірскі**—з 1917 г., рабочы; 11) **Авэрфэльд**—з 1917 г., служачы; 12) **Дзешчанка, Я.** — з г., рабочы; 14) **Фрэйдзіна**—з 1919 г., работніца; 15) **Паласухін**—з 1917 г., рабочы; 16) **Гарэт, Я. Г.**—з 1919 г., рабочы; 17) **Харун І. І.**—з 1917 г., рабочы; 18) **Быстроў**—з 1918 г., рабочы; 19) **Шульман, Ф. А.**—з 1918 г., рабочы; 20) **Вуйчык, Т. Н.**—з 1918 г., рабочы; 21) **Скулак, В. К.**—з 1922 г., рабочы; 22) **Жукоўскі**—з 1918 г., рабочы; 23) **Маргелаў**—з 1918 г., рабочы; 24) **Марозаў**—з 1918 г., рабочы; 25) **Зак**—з 1918 г., рабочы; 26) **Кузьняцоў**—з 1918 г., рабочы; 27) **Клябанаў, С.** з 1917 г., рабочы; 28) **Лазараў** — з 1917 г., селянін; 29) **Зіньковіч** — з 1918 г., рабочы; 30) **Зільбэрман**—з 1915 г., рабочы; 31) **Радзільюкевіч**—з 1919 г., рабочы; 32) **Радкевіч**—з 1918 г., рабочы; 33) **Астапенка**—з 1918 г., рабочы; 34) **Львовіч**—з 1918 г.—з 1918 г., рабочы; 13) **Зыбін Я.**—з 1914 20 г., селянін; 35) **Муроўёў**—з 1917 г., рабочы; 36) **Буйноўскі**—з 1918 г., рабочы; 37) **Мушкацін**—з 1919 г., рабочы; 38) **Дзергачоў**—з 1918 г., рабочы; 39) **Лабаты, П. Х.**—з 1918 г., селянін; 40) **Казлоў**—з 1918 г., рабочы; 41) **Аверкін**—з 1918 г., рабочы; 42) **Аршахоўскі**—з 1906 г., рабочы; 43) **Тугунаў**—з 1919 г., рабочы; 44) **Янчук, Ф. Г.**—з 1919 г., рабочы; 45) **Арусан, Р. А.** з 1917 г., селянін; 46) **Арлоўскі**—з 1917 г., рабочы; 47) **Далганаў**—з 1919 г., рабочы; 48) **Пракудзін**—з 1919 г., рабочы; 49) **Бурмістраў**—з 1919 г. рабочы; 50) **Росься, А. М.**—з 1917 г., селянін; 51) **Баскін, С. У.**—з 1919 г. рабочы; 52) **Дудачкін**—з 1919 г., рабочы; 53) **Ермакоў, А. П.**—з 1921 г., рабочы, 54)**Емельянаў**—з 1918 г., рабочы; 55) **Гарбуноў, А. Е.**—з 1917 г., рабочы; 56) **Красік**—з 1920 г., селянка; 57) **Ляхем**—з 1919 г., рабочы; 58) **Несьцяровіч**—з 1919 г., рабочы; 59) **Пазьнякоў**—з 1919 г., селянін; 60) **Максіменка**—з 1917 г., рабочы; 61) **Канавалаў, Я. Я.**—з 1918 г., селянін; 62) **Балотнікаў**—з 1918 г., рабочы; 63) **Хасман**—з 1903 г., рабочы; 64) **Зільдовіч, М. Е.**—з 1918 г., рабочы.

## Што показалі перавыборы бюро ячэек

### (Барысаўская арганізацыя КП(б)Б)

На фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна» пачаліся перавыбары бюро цэхавых парт'ячэек. Цэх'ячэйка фанэрнага аддзяленьня правяла свой перавыбарчы сход 10 мая. Бюро цэх'ячэйкі зусім не падрыхтавалася да правядзеньня перавыбараў. Характэрна, што перавыбарчы сход быў закрытым. На запытаньні, чаму гэта так, сакратар ячэйкі адказаў:—«дырэктыў аб правядзеньні перавыбараў я ня чытаў, а таму сход будзе закрыты». Бюро вылучыла камісію па самаправерцы, але гэта камісія зусім не працавала. Цікава, што некаторыя члены камісіі толькі на перавыбарчым сходзе даведаліся аб тым, што яны вылучаны ў камісію па самаправерцы.

Гэтыя арганізацыйныя недахваты адбіліся на правядзеньні перавыбарчага сходу. Справаздача бюро насіла павярхоўны характар. Па традыцыі вынесьлі сухую шаблённую пастанову: «Прызнаць работу бюро здавальняючай». Толькі актыўныя спрэчкі, што разгарнуліся пасьля дакладу, зглядзілі непадрыхтаванасьць бюро. Зброя самакрытыкі з боку радавых партыйцаў была накіравана на адмоўныя бакі ў рабоце ячэйкі.

Ячэйка ня цікавіцца вытворчым жыцьцём фанэрнага аддзяленьня, работа цэхавай вытворчай камісіі зусім заняпала. Адміністрацыя ня выконвала каштоўных вытворчых прапаноў рабочых. Такія казённыя адносіны да рабочай ініцыятывы выклікалі абурэньне сярод рабочых фабрыкі.

Ячэйка не зьвяртала на гэта ніякай ўвагі. Гэта—вялікі мінус у масавай рабоце цэх'ячэйкі. Адзінкі з ліку партыйцаў парушаюць працоўную дысцыпліну, хуліганяць, дрэнна выконваюць сваю работу і г. д. Ячэйка да гэтага часу не зрабіла ніякіх захадаў да зьнішчэньня гэтых зьявішч. Частка членаў ячэйкі—хвасьцісты і шкурнікі, якія патураюць шкодным настроям адсталых рабочых. У фанэрным аддзяленьні ёсьць група рабочых, якая распаўсюджвае па цэху розныя недарэчныя шкурніцкія чуткі. Усё гэта робіцца на вачох партыйцаў, які не растлумачваюць рабочай масе ўсю шкоднасьць гэтых чутак. Культурна-выхаваўчая работа ў фанэрным аддзяленьні праводзіцца нездавальняюча. У часе рэлігійных сьвят значная колькасьць рабочых ня выходзіць на работу. Антырэлігійныя прапагандыстыя заснулі. Ячэйка ня ўжывае беларускую мову. Беларусізацыя зусім не адчуваецца. На «Чырвонай Бярэзіне» яшчэ будуць праведзены перавыбарчыя сходы на 7 цэхавых парт'ячэйках. Бюро гэтых ячэек павінны дасканала азнаёміцца з практыкай правядзеньня перавыбарчага сходу ў ячэйцы фанэрнага аддзяленьня. Трэба ўлічыць усе памылкі бюро цэх'ячэйкі фанэрнага аддзяленьня, каб папярэдзіць іх паўтарэньне. А галоўнае трэба памятаць: перавыбарчыя сходы павінны быць масавымі.

## Абсьледваньне Нова-Беліцкай раённай партарганізацыі

Гомельскі акругком КП(б)Б прыступіў да абсьледваньня Нова-Беліцкай партыйнай арганізацыі. Асноўная задача абсьледваньня — праверка выкананьня дырэктыў акругкому і важнейшых агульна-партыйных пастаноў па гаспадарчым будаўніцтве і партыйна-масавай работы на прадпрыемствах.

Асаблівая ўвага будзе зьвернута на праверку масавай работы ў цэхах. На фабрыцы «Вэзуві» ліквідавана бюро калектыву, і райком партыі непасрэдна кіруе работай цэх'ячэек. Абсьледваньне выявіць, наколькі гэта сябе апраўдала.

Партарганізацыя Нова-Беліцы вылучыла 7 камісій у складзе 37 партыйцаў у дапамогу абсьледвальнікам. Абсьледаваны будуць ячэйкі фабрыкі «Вэзувій», «Чырвоны Хэмік» і станцыі Нова-Беліца.

# НА С.-ГАСПАДАРЧЫМ ФРОНЦЕ

## Саўгасы, уступайце ў сацыялістычнае спаборніцтва

**ГОМЕЛЬ. (Наш кар.).** Выкананьне пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва патрабуе ўвагі ўсіх працоўных гораду і вёскі. Між тым, у акрузе ёсьць шмат прадпрыемстваў і арганізацый, што яшчэ не ўступілі ў сацыялістычнае спаборніцтва. У першую чаргу сюды трэба аднесьці саўгасы.

У саўгасах Гомельшчыны з працоўнай дысцыплінай, прадукцыйнасьцю працы, зьніжэньнем сабекошту прадукцыі—ня ўсё добра. Абсьледваньне буйных саўгасаў выявіла, што рабочы дзень не запоўнены, няма належнага нагляду за гаспадаркай. У выніку ва многіх саўгасах ураджайнасьць галоўных культур зьніжаецца. Прыкладна, у саўгасе Барысаўшчына ўраджайнасьць жыта ў 25 г. дасягнула 73 пуд. з гэктара, а ў 28 г.—46, у Рудакоўскім саўгасе ўраджайнасьць бульбы ў 27 г. дасягнула 650 пуд., а ў 28 г.—405 пуд. і г. д. Сабекошт прадукцыі павялічыўся. Так, у Стара-Беліцкім саўгасе сабекошт пуду жыта ў 27 г. складаў 1 р. 90 кап., а ў 28 г.—2 р. 25 кап., у Рудакоўскім саўгасе сабекошт аўсу ў 25 г. раўняўся 1 р. 45 кап., у 28 г.—2 р. 40 кап. Літар малака ў 27 г. каштаваў 16 кап., у 28 годзе —22 кап.

Трэба адзначыць, што ў саўгасах ёсьць усе магчымасьці як для ўзьнімцьця ўраджайнасьці, так і для зьніжэньня сабекошту. Дзе-ж прычыны такога гаспалараньня.

**Асноўная прычына—агідныя адносіны загадчыкаў гаспадарак, часьці рабочых і нізавых праф'ячэек да пытаньняў узьняцьня ўраджайнасьці і сабекошту прадукцыі. Вытворчыя камісіі ў большасьці саўгасаў працавалі слаба.**

Зараз заўважаецца ўжо некаторы пералом, саўгасы пачынаюць барацьбу за лепшы ўраджай, ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі і ўраду.

Кожны саўгас ставіць перад сабой пэўныя задачы. Для больш пасьпяховага выкананьня саўгасы Беларусі павінны далучыцца да агульна-саюзнай вытворчай нераклічкі—сацыялістычнага спаборніцтва.

## Трактары і насеньне калгасам

МАЗЫР. (Наш кар.). Гадавым плянам прадугледжана было арганізаваць 35 калгасаў. На сёньняшні дзень па акрузе ўжо арганізавана 39 калектыўных гаспадарак на плошчы звыш 7.000 гэктараў зямлі.

Усе калгасы забясьпечаны гатункавым насеньнем і неабходнымі крэдытамі.

Плянам акрэа прадугледжана за лета гэтага году зямляўпарадкаваць 26 калгасаў.

У акругу прыбылі 2 трактары, якія перададзены 2-м калгасам Юравіцкага і Калінкавіцкага раёнаў.

Трэба, аднак, адзначыць, што не на ўсіх раёнах акругі створана належная грамадзкая думка сярод сялянства вакол пытаньняў калектывізацыі. У Аваруцкім і Лельчыцкім раёнах справа калектывізацыі пастаўлена слаба. Падругое, ня зьвернута ўвага на арганізацыю буйных калгасаў і на перавод прасьцейшых аб'яднаньняў на калектывізацыю (да гэтага часу ніводзін пасёлак не перайшоў яшчэ на калектыўную апрацоўку зямлі).

## На кантрактацыю зварачаецца мала ўвагі

**ВОРША. (Наш кар.).** У гэтым годзе Аршанскай акрузе дана не малое заданьне на кантрактацыю пасеваў. Але да гэтага часу на справу кантрактацыі зварачалася мала ўвагі. Гэта датычыць, як крэдытных таварыстваў, так і сельсаветаў і райвыканкомаў. Асабліва райвыканкомы (за некаторымі выключэньнямі) вельмі слаба кіравалі працай па кантрактацыі. Разгортвалася работа з халадком, і вось вынікі дзякуючы гэтаму нездавальняючыя.

Плян выканан так: па ільну-валакне —на 60 проц., ячмені—24 проц., аўсе—22 проц., канюшыне—19 проц., бульбе —18 проц. і па канаплях—2,2 проц.

Групавая кантрактацыя праводзіцца яшчэ слабей.

Трэба таксама адзначыць, што ня ўсім нязначны ўдзел у кантрактацыі з боку калгасаў і інш. вясковых каапэрацыйных аб'яднаньняў. З 200 існуючых па акрузе аб'яднаньняў кантрактуюць: бульбу—11, лён-валакно—9 і канюшыну—8.

Такім чынам, тыя каапэрацыйныя арганізацыі, якія павінны былі ў першую чаргу кантрактаваць свае пасевы, гэтага ня робяць.

Трэба заварушыцца, падцягнуцца. У апошні момант акрыканком зьвярнуў увагу на пагражаючае становішча з кантрактацыяй і прыняў меры для яе пашырэньня.

А. М.

## Машыну бліжэй да спажыўца

Вышэйшыя эканамічныя органы прынялі рад пастаноў аб паляпшэньні выпуску сельска-гаспадарчых машын. У зьвязку з гэтым гомельскі завод сельска-гаспадарчых машын «Рухавік Рэвалюцыі» атрымаў заданьне па пашырэньні вытворчай праграмы. Ажыцьцяўленьне апошняй праводзіцца в вялікай напружанасьцю, усе цэхі перагружаны да адказу. У параўнаньні з мінулым годам праграма павялічана на 41 проц.

У першым квартале праграма выкананa з разьмерам 97,5 проц., у другім квартале можна спадзявацца, што праграма будзе выканана поўнасьцю.

Вышэйшыя эканамічныя органы прынялі рад пастаноў аб паляпшэньні выпуску сельска-гаспадарчых машын. У зьвязку з гэтым гомельскі завод сельска-гаспадарчых машын «Рухавік Рэвалюцыі» атрымаў заданьне па пашырэньні вытворчай праграмы. Ажыцьцяўленьне апошняй праводзіцца в вялікай напружанасьцю, усе цэхі перагружаны да адказу. У параўнаньні з мінулым годам праграма павялічана на 41 проц.

У першым квартале праграма выкананa з разьмерам 97,5 проц., у другім квартале можна спадзявацца, што праграма будзе выканана поўнасьцю.

У такім становішчы мы можам апынуцца ў бліжэйшыя дні. Гандлёвыя арганізацыі павінны неадкладна ўзмацніць нагрузку машын з заводу і прасоўваць машыны ў раёны, непасрэдна да спажыўца і рабочыя заводу напружваюць усе сілы да таго, каб выканаць праграму, гандлёвыя арганізацыі вабіраюць машыны надзвычайна марудна, колькасьць машын, што застаецца на заводзе, значна перавышае магчымасьць іх захаваньня.

Накапленьне вялікіх запасаў сельгасмашын на тэрыторыі заводу тармозіць работу зборнічыкаў і ставіць пад пагрозу выкананьне вытворчага пляну.

## „Зьвязда" дапамагла

**«Былых гандляроў трэба гнаць з каапэрацыі»**—так пісаў селькор **«Ведаючы»** ў сваёй заметцы **«Сядко багаты купец»**. Але Тураўскае спажывецкае таварыства рабіла наадварот. Праўленьне т-ва прыняло на службу ў якасьці «спэца» былога **тураўскага** спэкулянта **Гіцэльмана Х.** Як былы спэкулянт, **Гіцэльман** і ў каапэрацыі стаў спэкуляваць. Ён набраў каапэрацыйнай крамніны і паехаў па вёсках, дзе і пачаў спэкуляваць в злоўжываньнем. Мазырская АКК-РСІ, куды заметка рабкора была накіравана па рассьледваньне, паведамляе, што справа аб **Гіцэльману перадана судовым органам.**

**Зьнялі з працы настаўніцу** Каралінскай сямігодкі (Мазыршчына) **Айзэнман.** У сваёй працы яна практыкавала такі «мэтад»: па паўгода не выклікала вучня, ні разу ня пыталася ў яго, а потым ставіла яму ў залік «нездавальняюча». Наоўгл у Айзэнман у школе былі «свае» і «чужыя». Гэта зразумела, калі прыняць пад увагу, што гэта настаўніца былая абшарніца, у маёнтку якой (1 кілёмэтр ад школы)—цяпер камуна. Справа выкрыта селькораўскай заметкай **«Навучаюць»**, пасланай на рассьледваньне ў Мазырскую АКК-РСІ.

**Пілі дома і ў госьцях** і на працу прыходзілі п'янымі—гэта працаўнікі Калінкавіцкай пошты **Альхімовіч, Руды і Цітоў.** Хацелі людзей перасьцерагчы: была пастанова Мазыр. РСІ аб зьняцьці п'яніц з працы яшчэ ранней, але пастанова ня выканана, а тым часам п'янства на пошце ня спынялася. Прышлося **пацьвердзіць** пастанову РСІ і зьняць з працы **Альхімовіча і Рудога,** а **Цітову** пакуль што абвешчана вымова з напярэджаньнем. Справа ўзьнята селькорам **«Бачыўшым».**

**«Эпідэмія зьвышнормавай працы»**—так рабкор **«Мятла»** назваў сваю заметку. **«Эпідэмія»** існавала ў Мазырскім Акрфа. Загадчык казначэйскай часткі **Рафэйчык** ня лічыў нават патрэбным такія зьвыш

ЛІСТОК РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ІНСПЭКЦЫІ

# АПАРАТ—ПАД АГОНЬ КРЫТЫКІ МАС!

## Пухавіцкі раён пад праменьнямі пражэктару РСІ

### НА ДРЭННАЙ РАБОЦЕ НЕКАТОРЫХ ПУХАВІЦКІХ УСТАНОУ, НА ТЫМ, ЯК НЯ ТРЭБА ПРАЦАВАЦЬ,—НЯХАЙ ВУЧАЦЦА УСЕ ПРАЦАУНІКІ НІЗАВОГА АПАРАТУ

### Агляд нашых раёнаў і весак павінен паказаць хібы ў рабоце цэнтральных установаў

## Агляд у дапамогу чыстцы апарату

### Без азнаямленьня з работай паасобных работнікаў апарату, мы ня зможам пачаць чыстку

Мы ўжо маем пэўную практыку работы органаў КК-РСІ па падрыхтоўцы да чысткі апарату. Ужо сабраны значны матар'ял, які зараз пімат дзе ўжо дразнраецца рабочымі брыгадамі.

Здавалася, што ўсё зроблена, што далей няма куды ісьці, што можна ўжо прыступіць да простай чысткі апарату.

Але аналіз гэтых матар'ялаў нам гаворыць зусім іншае. Мы яшчэ ня маем усяго таго, што нам патрэбна.

Аб чым гаворыць большасьць матар'ялаў, якія ёсьць у нас? Яны галоўным чынам характарызуюць таго ці іншага работніка з пункту погляду яго сацыяльнага пахаджэньня ці паасобных яго цяперашніх учынкаў. А наконт агульнай лініі работы данага працаўніка, усёй установы ў цэлым мы ніякіх даных ня мелі.

Гэта выклікае сур'ёзную небясьпеку. Як-бы ня выкінуць з апарату дробных асоб, а мацёрых бюракратаў пакінуць у апараце, толькі таму, што на іх у камісію садзейнічаньня ці ў РСІ не паступіла ніякіх заўваг, ніякіх матар'ялаў?

Трэба таксама канстатаваць, што масы яшчэ не раскачаліся. Мы яшчэ ня маем масавай крытыкі апарату, якасьці яго працы, лініі работы супрацоўнікаў яго ні з боку працоўных, якія абслугоўваюцца апаратам, ні з боку саміх супрацоўнікаў установы.

Што камісіі садзейнічаньня мала чаго робяць, каб выкарыстаць час, што застаўся да чысткі, для азнаямленьня з работай апарату, з лініяй работнікаў, якія адказваюць за той ці іншы вучастак работы, сьведчыць агляд работы судзьдзі Пухавіцкага раёну, які сёньня падаецца ў «Зьвязьдзе». Тут-жа ў адным будынку з камісіяй працуе суд. Чаму-б ім не азнаёміцца з тым, як ён працуе; можна і па вырашаных справах, можна і прысутнасьцю на судовых пасяджэньнях? Між тым толькі выпадковасьць выкрыла няправільныя мэтады і лінію работы Пухавіцкага судзьдзі Эвэнчыка.

Нам трэба ўявіць сабе галоўнае: бяз увязкі чысткі апарату з асноўнымі пытаньнямі недахватаў і нездаровых зьявішч у нашым апараце мы канкрэтных вынікаў не атрымаем.

Таму асаблівую ўвагу нам трэба зьвярнуць на агляд савецкай установы.

Што нам можа даць агляд?

Папершае, агляд павінен арганізаваць масы вакол справы барацьбы з няправільнымі мэтадамі работы апарату, з бюракратызмам і цяганінай. Агляд павінен садзейнічаць разгортваньню самакрытыкі і ўзмацніць сапраўдны кантроль рабочай грамадзкасьці за дзейнасьцю ўстаноў.

Падругое, агляд павінен садзейнічаць паляпшэньню якасьці работы апарату, падцягваньню пасыўных служачых, якія дагэтуль не адчувалі рабочага кантролю, якія будуць сябе зараз адчуваць пад шкляным каўпаком, пад сталым наглядам усёй грамадзкасьці.

Агляд работы апарату павінен праводзіцца на старонках друку, у насьцегазэтах, на агульных сходах служачых установ з працоўным насельніцтвам.

**Сёньня мы пачынаем агляд Пухавіцкага раённага апарату.** Адначасова пачаўся ўжо агляд работы раёну на сходзе служачых раёну з сялянствам, рабочымі, батракамі і г. д. Самакрытыка ў раёне набывае новы штуршок, ад гэтага павінна бязумоўна палепшыцца якасьць работы і складу савецкага апарату раёну.

Адначасова рабочыя брыгады і камісіі садзейнічаньня павінны не абмяжоўвацца праверкай паступіўшых заяў. а знаёміцца з работай паасобных работнікаў апарату, ацаніць тую карысьць ці шкоду, якую яны прынесьлі дзяржаве сваёй працай.

Толькі такім шляхам чыстка апарату дасягне сваёй мэты, толькі такім шляхам мы здолеем прыстасаваць апарат да новых задач сацыялістычнага будаўніцтва, рэканструкцыі нашай гаспадаркі.

**Я. Ракаў.**

## Судзьдзя Эвэнчык—у ролі „архіерэя“

### Мірыць царкоўнікаў і штрафуе сялян

Ёсьць у Пухавіцкім раёне суд. Суд, як суд, але мэтады і лінія працы 2-га судзьдзі Эвэнчыка зусім не да твару савецкай юстыцыі.

Падамо пару фактаў.

У нядзелю 5-га мая, судзьдзя т. Мельнікаў паехаў у раён і перадаў справы т. Эвэнчыку. На гэты дзень (выхадным днём зьяўляецца панядзелак) было прызначана 11 спраў. Але тав. Эвэнчык на працу ня вышаў і прыехаўшыя сяляне вярнуліся назад.

Як тав. Эвэнчык вядзе судовыя справы, як ён адносіцца да насельніцтва?

У часе судовага пасяджэньня (аўтар гэтых радкоў 2 дні сядзеў і слухаў, як тав. Эвэнчык вядзе справы), ён літаральна зьдзекуецца з сялян. Яго звычайныя выразы: «я вас выведу ў момант», «я вас аштрафую ў момант», і ў сапраўднасьці «ў момант» штрафуе Вось ён бяз усякіх доўгіх размоў аштрафаваў на 3 руб. сялянку за тое, што яна пасьля дачы паказаньня (яна можа першы раз у судзе), як сьведка, выйшла на хвіліну ў калідор. Ці сялянку, якая два словы сказала суседцы, аштрафуе на 2 рублі, і тут-жа загадвае: «вывесьці яе», калі сялянка нават не змагла разабрацца ў тым, што-ж, уласна кажучы, з ёю здарылася.

Аб лініі тав. Эвэнчыка сьведчаць дзьве «царкоўныя» справы, якія ён вырашыў, відавочна, «па літары закону».

Вось існуе царкоўны савет Блоньскай царквы ў складзе 5 асоб. старшынёю зьяўляецца гр. Сянько. Адзін з блажэннай пяцёркі Шклярык добраахвотна выходзіць з савету. Але аказаліся непаразуменьні з грашыма і чаньвёрка падае ў суд на Шклярыка. што ён ня даў справаздачы ў выдаткаваньні 40 руб.

Суд (ня Эвэнчык) рэзонна адмаўляецца разьбірацца і займацца ўнутранымі спрэчкамі царкоўнікаў.

Але тут на сцэну выходзіць Менскі акруговы суд, які загадвае прыняць справу, бо на падставе такіх і такіх артыкулаў і пунктаў царкоўнікі могуць выступаць ня як юрыдычныя, а як фізычныя асобы.

Справу вёў тав. Эвэнчык. Ён прысудзіў гэтым фізычна-юрыдычным асобам з Шклярыка 24 руб.

Але гэтым справа ня скончана. Па выхадзе з суду, Шклярык заяўляе Сянько: «Ты мяне абвінавачаеш, што я прысвоіў 40 руб., а ты ня краў сьвечак з царквы»? Зноў умешваецца пралетарскі суд. Заступаецца за абражанага царкоўнага старасту. У адсутнасьці падсуднага Шклярыка, дапытваюць Сянько і некалькіх сьведак (магчыма з таго-ж царкоўнага савету) і Шклярыка аштрафоўваюць на 15 руб. за абразу сумленнага царкоўнага старасты. Мы-б з свайго боку прапанавалі судзьдзі ўмешвацца ў сварку паміж панам і дзяком. Гэта дало-б карысьць дзяржаве і раённаму бюджэту і наладзіла-б добрыя «норавы» ў царкоўным жыцьці.

Не, нам думаецца, што тав. Эвэнчык, ня гледзячы на сваю вышэйшую асьвету, у ролі судзьдзі не на месцы. Яго веды трэба выкарыстаць, але яго на «гарматны стрэл» ня трэба дапускаць да тых галін работы, дзе ён будзе сустракацца з насельніцтвам.

**Я.**

## Фінансавыя справы Пухавіцкага раёну

### Як фінчасьць РВК „выконвае“ дырэктывы

Работа фінчасьці Пухавіцкага РВК ня можа быць прызнана здавальняючай. Асабліва гэта закранае кампанію па самаабкладаньні і падатковыя скідкі гаспадаркам.

Пры пераглядзе абкладаньня серадняцкіх гаспадарак быў зусім змазаны палітычны бок гэтае справы. Былы загадчык фінчасьцю РВК няўважліва і часта нядбайна адносіўся да даручанае яму справы. Не дакладваў своячасова Прэзыдыуму райвыканкому аб атрыманых распараджэньнях, а апошні ня цікавіўся і таму ня мог даваць належных указаньняў і дырэктыў. Дзякуючы такому становішчу сьпісы гаспадарак, якім павінна была быць дана скідка, не абгаворваліся на сходах беднаты, на пленумах і прэзыдыумах сельскіх саветаў і гэта пытаньне ў большай сваёй частцы было вырашана проста габінэтным, бюракратычным парадкам, бяз удзелу нават прадстаўнікоў сельскіх саветаў. Прычым работа гэта праведзена надзвычайна хутка, ў працягу 3-х дзён. А між тым тэрмін для падрыхтоўкі быў выстарчальны і вычэрпваючыя практычныя ўказаньні былі даны своячасова.

Ня лепш абстаіць справа і з самаабкладаньнем. Тут, бадай, мы мелі ўзорны прыклад цяганіны, бяссыстэмнасьці і нядбайнасьці.

Закон і інструкцыі аб правядзеньні самаабкладаньня былі атрыманы фінансавай часткай у першых лічбах сьнежня. Праз некалькі дзён гэта пытаньне заслухоўваецца ў адпаведных дырэктыўных органах. У студзені зноў там-жа яго разглядаюць і прапануецца РВК закончыць работу да 20-га лютага. Але, як выявілася, толькі да 15-га лютага, праз **2½ месяцы**, складаецца плян правядзеньня гэтай кампаніі, якая мае надзвычайна важнае значэньне.

Сельскія саветы не зрабілі разьлікаў і ня склалі каштарысаў для розных мяркуемых мерапрыемстваў, патрэбных для сялянства. Былі выпадкі, калі на сходах нават не абвяшчалася і не абгаворвалася мэта, для якое прымалася самаабкладаньне. А патрэб для задаваленьня ў вёсцы яшчэ вельмі шмат. Тут табе і дарогі дрэнныя, і мост правалёўся, і пажарны хлеў трэба зрабіць, і пажарную машыну купіць, і школу паправіць і г. д.

Нельга не сказаць таксама яшчэ аб скарыстаньні сабраных сум самаабкладаньня мінулага году. Сход грамадзян пасёлку Мар'іна-Горка, Блонскага сельсавету пастанавіў на сабраныя сродкі адрамантаваць грамадзкую лазьню. За рамонт узяліся энэргічна восеньню мінулага году, але.... рамантуюць і да гэтага часу. Лазьня прыведзена цяпер у такі стан, што мыцца нельга і насельніцтва пасёлку праклінае той дзень і гадзіну, калі вынесьлі сваю пастанову аб яе рамонце. Рамонт ня скончаны, між тым, як нядоімка ў 415 руб. застаецца неспагнанай. РВК даручыў нагляд за рамонтам камгасу, але гэта даручэньне засталося толькі на паперы і, як відаць. камгас зусім не адчувае за сабой адказнасьці, бо, як паказаў непасрэдны агляд, рамонт зроблен вельмі дрэнна, што не магло-б здарыцца, калі-б за ім наглядаў камгас.

Рэвізыйная-ж камісія Блонскага савету не праявіла ў даным выпадку сваёй ініцыятывы і такое становішча, як відаць, ня выклікала ў яе нават інтарэсу.

Выкладанае тут зьяўляецца яскравым прыкладам таго, **як ня трэба працаваць**, як фактычна, часамі, парушаюцца дырэктывы партыі і савецкай улады. Трэба зараз РВК і сельскім саветам узяцца за выпраўленьне ўсіх недахопаў, за ажыцьцяўленьне мэт самаабкладаньня, і г. д.

**Н.**

## Культасьветныя ўстановы бяз кіраўніцтва

### Чытаць, пісаць—могуць? Зусім даволі

Пухавіцкі райвыканком дае надта дрэнны прыклад у галіне кіраваньня культасьветнай справай: школамі, хатамі-чытальнямі і г. д. Непасрэдна кіруе гэтай працай раённы інспэктар-па нарасьвеце т. **Лазарчык**, таму галоўная доля віны за дрэннае кіраваньне кладзецца на яго, але-ж адказвае за гэта і райвыканком наогул, які зьвяртаў мала ўвагі на пытаньні культурнага будаўніцтва.

Даволі таго, што **пленум райвыканкому** за ўвесь 1928 г. і першы квартал 1929 г. ні на адным сваім пасяджэньні, якіх было за гэты час з 6, не заслухаў якога-небудзь пытаньня культурнага будаўніцтва на раёне. Прэзыдыум-жа разглядаў гэтыя пытаньні без усялякай сыстэмы.

Так, зусім ня былі заслуханы вынікі школьнага навучальнага году, зімовай работы ліквпунктаў і хат-чытальнаў за за зіму 1927-28 г. Без належнай падрыхтоўкі былі разгледжаны вынікі абгаварэньня праекту пастановы 2-й сэсіі ЦВК БССР па пытаньні аб сыстэме нарасьветы—гэта зроблена па прапанове зьверху, а па сваёй ініцыятыве прэзыдыум заслухаў толькі такія пытаньні:

1) плян усеагульнага навучаньня і будаўніцтва новых школ (у чэрвені мінулага году);

2) укамплектаваньне школ настаўнікамі (перад пачаткам школьных заняткаў у верасьні);

3) праект абавязковай пастановы аб усеагульным навучаньні ў раёнах поўных школ (са спазьненьнем, толькі ў сьнежні);

4) пляны разьмеркаваньня фонду дапамогі бяднейшым вучням і стыпэндый;

5) аб выпадках антысэмітызму ў Пухавіцкай сямігодцы і, нарэшце, такія дробныя пытаньні, як зацьвярджэньне ўмоў на пабудову мэблі і інш.

З пытаньняў палітасьветнае працы прэзыдыум разглядаў толькі 2 разы справаздачу райпалітпрасьветкому (у маі і сьнежні) і справаздачу Сяргеевіцкай хаты-чытальні (у верасьні).

Гэткае кіраўніцтва прэзыдыуму трэба лічыць **зусім нездавальняючым.**

Як-жа працаваў **райінспэктар?** Аб выніках абсьледваньня школ ён дакладваў на так званых пэдагагічных радах пры апорных школах у сельсаветах. Ніякіх актаў абсьледваньня не складалася, у пратаколах пэдрад толькі зафіксаваны наступныя вынікі, прыкладна: уражаньне ад школы здавальняючае (або трохі нездавальняючае), чытаюць добра, пішуць слаба.

Ці-ж гэта кіраваньне?.. Аб выніках сваіх «спроб абсьледваньня» райінспэктар ні разу не далажыў тым сельсаветам, на тэрыторыі якіх ён «абсьледаваў» школы або хаты-чытальні.

Пад непасрэдным кіраваньнем райінспэктара знаходзіцца райпалітасьветком. За 1928 г. і частку 1929 г. ён зьбіраўся толькі 3 разы, але-ж і тыя пратаколы загінулі.

За такую дрэнную працу райпалітасьветкому нясе адказнасьць вядома і райком партыі, прадстаўнік ад якога ўваходзіць ў склад райпалітасьветкому.

Райінспэктар скардзіцца, што яго загружаюць канцылярычнай і рознымі кампаніямі, якія да яго асноўнай працы не датычаць. У значнай частцы гэта справядліва. Дзеловоды РВК не вядуць яго перапіскі. Таму ўся перапіска яго за ўвесь 1928 г. і нават часткай за 1926 і 1927 г. і за частку 1929 г. згруджана ў адной папцы, у якой знаходзіцца і іншым пытаньням, якія даручаліся яму РВК, райкомам, ячэйкай, таксама розныя службовыя запіскі, наогул розны хлам. Паколькі выкананыя адносіны ляжаць сумесна з невыкананымі, копіі асобна ад падстаў, нельга што-небудзь высьветліць у гэтым хаосе.

Папяровае кіраўніцтва складалася толькі з перадрукаваньня паперак акруговага інспэктарыяту асьветы, напамінкаў аб прыёмцы справаздач і г. д. Свайго нічога ня ўносілася.

Сельсаветы таксама мала цікавіліся культасьветнымі справамі, культкамісіі пры іх амаль зусім не працавалі, бо і дапамогі ім і інструктаваньня ня было.

**А. Б.**

## Памешчык і кулак у складзе сельсавету

Як праходіла перавыбарчая кампанія ў паасобных мясцох Пухавіцкага раёну, характарызуюць выбары Блонскага сельсавету.

Яскравы штрых. У сельсавет абіраюцца б. памешчык Старажынскі Янка (мае 300 дзес. зямлі), кулак Рамановіч і яшчэ адзін. Упоўнаважаны на перавыбарах у паказаным сельсавеце, Амельчанка, ведаючы гэта, не палічыў патрэбным паставіць пытаньне аб іх адводзе. Паводле яго слоў «такой установкі ня было, і апрача таго, яны знаходзіліся і ў ранейшым складзе. зьяўляюцца прыкладнымі членамі сельсавету, правільна праводзяць клясавую лінію і беднята на іх ніколі ня скардзілася».

А між тым сельсавет ранейшага складу няправільна разьмяркоўваў сенажаць, лес, меў сувязь з кулацтвам. прысвойваў грошы, што здавалі сяляне, рабіў бясчынствы, злоўжываньні.

На ўсё гэта скардзілася беднота і скаргі яе былі справядлівыя, чаго не адмаўляе і сам Амельчанка, які праводзіў перавыбары.

РСІ невыстарчальна кіравала выбарамі і не прыняла мер да адводу клясавачужых нам людзей—кулакоў і былога памешчыка.

**Н—а.**

## „Бюракратызму ў мяне не заўважваецца“

Пярэшнства ў праяўленьні бюракратызму і казённічыны належыць Жыткавіцкаму раёну (Мазырскае акругі). Калі-б злажыць тыя вялізьнейшыя палотны, якія былі прысланы ў АКК-РСІ з Жыткавіцкага раёну (матар'ялы прысланы на супрацоўнікаў установу), то можна было-б прыкрыць імі ўсю плошчу Жыткавіцкага раёну. Цікавым зьяўляецца тое, што характарыстыкі і матар'ял складаліся не камісіяй садзейнічаньня, а тэхнічным працаўніком РВК. Што-ж ў выніку можна знайсьці ў доўгіх палотнішчах? Амаль нічога, за выключэньнем адной, найцікавейшай характарыстыкі на аднаго работніка, які выходзіць з батракоў, былога партызана. Пра яго напісана так, што ўсё добра, але.... «ёсьць нездаволенасьць камуністым». Што думалі яны гэтым сказаць, нам невядома....

Лельчыцкі раён не адстаў ад Жыткавіцкага, у некаторых момантах ён нават і выперадзіў яго. Калі ў Жыткавічах характарыстыкі складаліся тэхнічным працаўніком (які сам-жа на заўтра, па «сакрэце» расказаў аб гэтым усім), дык у Лельчыцкім раёне лепш зрабілі, там даручылі кожнаму супрацоўніку **самому на сябе складьці характарыстыку.** І вось што пісалі супрацоўнікі ў сваіх характарыстыках—«Да савецкай улады адношуся добра. Бюракратызму ў мяне не заўважваецца. Да наведвальнікаў адношуся добра. У чым і падпісваюся».. (як бачыце, лепшага і патрабаваць нельга).

Райвыканком на ўсе гэтыя характарыстыкі ставіў сваю пячатку і адсылаў у РСІ.

На пленуме АКК-РСІ, што нядаўна адбыўся, былі абгавораны ўсе гэтыя ненармальныя зьявы. Прыехаўшыя з месц таварышы ў сваіх выступленьнях адзначылі, што на мясцох (у мястэчках і вёсках) пытаньне аб чыстцы савецкага апарату слаба папулярызавана, працоўныя масы добра ня ведаюць, каго трэба вычышчаць, як будзе праводзіцца чыстка і г. д.

Пленум намеціў рад практычных мерапрыемстваў па ўзмацненьні падрыхтоўчай работы да чысткі савецкага апарату і па выпраўленьні зробленых памылак па гэтай лініі.

**Б. Ш.**

## Як Менскі АКРФА прагледзеў „сланя“

Як ужо высьветлена НК РСІ, мы нікольскі не памыляліся, калі ў сваім артыкуле «Аб сланёх з прыватнага таварыства «Слонь» (гл. «Зьвязду» ад 4/1—г. г.) катэгарычна сьцьвярджалі, «што афіцыяльная справаздачнасьць таварыства вядзецца ў напрамку, які пырока разыходзіцца з сапраўдным станам яго гаспадарчай справы, а органы Наркамфіну прымаюць яе за «чыстую ваду».

Сваім артыкулам мы тады, між іншым, паказвалі, што прыватнікі ашукваюць дзяржаву, перапавялічваючы свае выдаткі і зьменшаючы, такім чынам, свае прыбыткі з мэтай памяншэньня падатку. Як відаць з матар'ялаў расьледваньня, таварыства ўключыла ў лік агульных выдаткаў прадпрыемства рад такіх выдаткаў, якія павінны былі пры вылічэньні сумы абкладаннага падатку быць уключаны ў валавы прыбытак. Так, замест аплаты камісійнай узнагароды ў разьмеры 2 проц. з сумы ўмовы, сьпісвалася на выдатак 5 проц. Выдаткі па процантах за крэдыт ня маюць апраўдальных дакумантаў. Грошы, унесеныя ўдзельнікамі таварыства, лічыліся не па рахунку статутнага капіталу, а па рахунку пераходзячых сум, і гэтыя 12 тысяч рублёў разглядаліся, як крэдыторская запазычанасьць, за якую плаціліся проценты незаконна. Выходзіць, што ўласьнікі атрымлівалі проценты **за свае-ж капіталы.** Камандыровачныя выдаткі таксама раздуты былі ў 2 разы супроць сапраўднасьці і праводзіліся на кнігах без адпаведных дакумантаў. Далей, на выдаткі ў выглядзе зарплаты служачым, сьпісваліся штомесячныя «пэнсіі» сыну ўладара Шлёзбэрга, яго дачцы і мужу апошняй. Наогул, такога роду махінацыямі прыватнікі ўталілі за 3 гады **45.245** руб. прыбыткаў ад дзяржавы, ня лічачы таго, што выявіў фінаддзел раней.

Далей, каб зьменшыць сабе норму абкладаньня, галоўны «спэц» Шлёзбэрг, атрымаўшы 50 проц. усіх прыбыткаў, уступіў нібы палову свайму сыну, якога дадаткова залічылі ў склад удзельнікаў таварыства без усялякага капіталу, што пацьвердзіла подпісам і пячаткаю натарыяльная дзяржаўная кантора.

Якім-жа чынам магло ўсё гэта здарыцца, што на працягу 3 з лішкам гадоў прыватнікі абыходзілі савецкія законы і набівалі сабе кішэні за кошт дзяржавы?

Перш за ўсё, уладары мелі ў сваіх руках у якасьць бухгалтара члена саюзу. Зарына, які зараз працуе на дзяржаўнай галянтарэйнай фабрыцы. Гэты бухгалтар фармальна лічыўся толькі такім, а фактычна ён дзейнічаў, як сапраўдны ўдзельнік таварыства і, забыўшыся на гэты час пра сваё прафсаюзнае членства, актыўна дапамагаў прыватнікам рабіць злачынствы. Падругое, прыватнікі скарысталі нячуласьць і нядбайнасьць нашага фінапарату Менакрфа, які так пільна сочыць за прыбыткамі дзяржаўных устаноў, знаходзячы ўсялякія шляхі да паняліченьня сум прыбыткаў і ўжываючы строгія меры спагнаньня за несваячасовае прадстаўленьне балянсу, у адносінах адзінага ў акрузе прыватнага таварыства нечакана страціў і сваю пільнасьць нагляду і сваё выпаходніцтва на частцы выяўленьня сапраўдных прыбыткаў і, нарэшце, забыўся нават пра свае простыя элемэнтарныя абавязкі. Прыватнікі не прадстаўлялі спачатку каля 3 год балянсу і да гэтага часу не прадставілі апошняга за 1927-28 г.—гэта Менакрфа лічыць, як быццам, нармальным, бо ня прыцягвае таварыства да адказнасьці і не штрафуе яго, як гэта звычайна ім павінна рабіцца.

Улетку 1928 г. інспэктар фінаддзелу правярае балянс таварыства. Замест 20 тыс. страты, ён знаходзіць каля 6 тыс. руб. прыбытку, г. зн. што прыватнікі **ўталілі 26 тыс. руб. ад дзяржавы.** Але ні інспэктар, ні загадчык падаткамі ніякіх арганізацыйных вываўдаў з гэтага ня робяць.

І, урэшце, цяпер, калі высьветлілася ўсё гэта злачынства прыватнікаў, Менакрфа, а за ім і НКФ абмяжоўваюцца толькі дадатковым налічэньнем падатку. Так праводзяць таварышы з фінапарату клясавую лінію і ахоўваюць інтарэсы пралетарскай дзяржавы. Трэба мець звышблізарукасьць, каб не заўважыць адзінага ў акрузе «Сланя». Мы чакаем, што ЦКК-РСІ падбярэ Менскаму фінапарату належныя «акуляры».

**НІЛІН.**

## Чыстка апарату і вылучэньне новых кадраў[1])

Карэнным чынам перабудаваць дзяржаўны апарат, рашуча абнавіць склад яго працаўнікоў нельга, зразумела, у кароткі тэрмін. Гэта патрабуе доўгай, упартай работы. «Тут нічога нельга зрабіць пахрапам ці нацскам, бойкасьцю ці энэргіяй, ці якой-бы там ні было лепшай чалавечай якасьцю наогул»... 2)

Гэта перабудаваньне патрабуе значнай і ўпартай работы, і дасягненьні ў галіне сапраўднай рэарганізацыі і рашучага абнаўленьня людзкога складу дзяржапарату зьвязаны з нашымі посьпехамі ў галіне культурнай рэвалюцыі. «Нам трэба ва што-б там ні стала паставіць сабе задачай для абнаўленьня нашага дзяржапарату: папершае—вучыцца, падругое—вучыцца і патрэцяе—вучыцца і потым правяраць тое, каб навука ў нас не заставалася мёртвай літарай ці моднай фразай (а гэта, няма чаго граха таіць, у нас асабліва часта бывае), каб навука сапраўды ўваходзіла ў цела і кроў, ператваралася ў складаны элемэнт быту зусім і сапраўды»... 3)

Ніколькі не памяншаючы першачарговага значэньня вучобы і разгортваньня культурнай рэвалюцыі, мы павінны ўжо цяпер, не чакаючы, не адкладваючы гэтае справы, больш энэргічна весьці работу па перабудаваньні нашага апарату, апіраючыся на ўжо накопленую практыку і на некаторы, хаця і нязначны і невыстрчальны, наш культурны рост.

Стан дзяржаўнага апарату, ня гледзячы на некаторыя посьпехі, якія мы маем за апошнія гады, цяпер такі, што трэба прыняць апрача звычайнай работы на яго рацыяналізацыі і паляпшэньні, рад **асобных мер.** Мы ня здолеем вырашыць новыя больш ускладненыя задачы, зьвязаныя з новым пэрыядам, калі ня ўжывем у гэты пэрыяд рад такіх мерапрыемстваў, якія павінны падцягнуць апарат, вызваліць яго ад такіх элемэнтаў, якія перашкаджаюць праводзіць нашу лінію. Мы павінны канстатаваць значную засьмечанасьць апарату чужымі, варожымі і нягодным элемэнтамі. Перад намі стаіць задача ня толькі падрыхтоўкі і вылучэньня новых кадраў. У даны момант з асаблівай вострасьцю выпукляецца неабходнасьць вызваленьня апарату ад гэтага варожага і нягоднага балясту.

У зьвязку з гэтым, вялікае значэньне набывае пытаньне аб чыстцы. **Чыстка зрабілася настойлівай неабходнасьцю.** Ніна нярэдка падрываюць работу дзяр**цю.** Лістападаўскі пленум ЦК з гэтага поваду паказаў, што «бюракратычнае скажэньне, няўважлівасьць да патрэб працоўных, абураючая коснасьць і злачынная цяганіна нярэдка падрываюць работу дзяржоргканаў. Паасобныя зьвяньні дзяржаўна-каапэрацыйнага апарату даходзяць да простага разлажэньня і зрошчваньня з буржуазна-капіталістычнымі элемэнтамі насельніцтва, выклікаючы неабходнасьць карэннай чысткі гэтых органаў».

Зараз гэта чыстка праводзіць ў 30 мясцох Савецкага Саюзу. На практыцы ўжо праведзеных чыстак у гэтых раёнах трэба вырашыць пытаньне аб спосабах і прыёмах работы ў падыходзячай чыстцы апарату ўсюды.

Трэба адзначыць, што ўмы правядзеньні чысткі дзяржаўнага апарату быў дапушчаны рад дэфэктаў. Спынімся на важнейшых.

Наглядаецца пагоня за вялікім лікам вычышчаных. Зусім зразумела, што пры такой няправільнай устаноўцы значна ўзрасьце лік няўхільных пры ўсякай чыстцы памылак. І самая чыстка накіроўваецца на няправільны рэчышчы. Наша задача заключаецца зусім ня ў тым, каб выкінуць з апарату магчыма больш народу; **выкінуць трэба толькі тых, каго сапраўды непльга цярпець зараз у савецкім апараце.** У нагоні за вялікай колькасьцю вычышчаных, натуральна, зьнішчаецца патрэбная дакладнасьць, камісіі ідуць па лініі найменшага супраціўленьня, пачынаюць выганяць з апарату выключна на фармальных матывах, вычышчаюць выключна былых дваран, белых афіцэраў і г. д. Нярэдка справа даходзіць да курёзаў.

Пры такім падыходзе не зьвяртаюць увагі на якасьць работы кожнага працаўніка, а кіруюцца толькі анкетнымі данымі, сацыяльным пахаджэньнем і ранейшай работай. Так, з 16.970 чалавек, вычышчаных у 24 мясцох Саюзу, па даных на 15 лютага 1929 г., за бюракратызм выгнана ўсяго некалькі соцень чалавек, большасьць-жа прыпадае на былых белых афіцэраў, былых буйных чыноўнікаў, былых уласьнікаў, дваран і г. д.

Зразумела, большая частка ўсіх гэтых рэштак былых камандуючых клясаў зусім няпрыгодна да работы ў нашым апараце, многія прысмакталіся да яго, многія з іх сьвядома скажаюць нашу лінію,—**і іх выганяць з апарату трэба.** Але зусім ясна, што калі чыстка пойдзе толькі па лініі выгнаньня «былых», дык мы пакінем у баку, не закранем вялікі пласт сапраўдных бюракратаў новай фармацыі, якія не належаць да старога чыноўніцтва, афіцэрства і г. д. Наконт гэтага зусім правільна сказаў на камсамольскім зьезьдзе (май 1928 г.) тав. Сталін: «Калі-б справа ішла толькі аб старых бюракратах, барацьба з бюракратызмам была-б самай лёгкай справай. Бяда ў тым, што справа не ў старых бюракратах. Справа, таварышы, у новых бюракратах, справа ў бюракратах, якія спачуваюць савецкай уладзе, нарэшце, справа ў бюракратах з камуністых. Камуністы—бюрократ—самы небясьпечны тып бюракрата. Чаму? Таму, што ён маскуе свой бюракратызм годнасьцю члена партыі. А такіх камуністычных бюракратаў у нас, на жаль, нямала».

Не ганяючыся абавязкова за вялікай колькасьцю вычышчаных, трэба выганяць не па фармальных адзнаках, а незалежна ад пахаджэньня, ачышчаць дзяржаўны апарат ад людзей, якія не жадаюць і ня могуць праводзіць лінію пралетарскае дзяржавы, якія разлажыліся, перарадзіліся, зрастаюцца з кулацкімі, нэпманскімі элемэнтамі.

Работа па праверцы людзкога складу ў радзе месц вядзецца зусім **адарвана, бяз усякай сувязі з характарам работы ўстановы.** Дзеля таго, каб чыстка ня была маханічнай, толькі анкетнай, каб яна выкрыла тых, каго сапраўды нельга зараз пакінуць на рабоце, трэба ўвязаць чыстку з недахватамі і нездаровымі зьявішчамі ў рабоце данае ўстановы. Такі адзіна-правільны падыход патрабуе правядзеньня сур'ёзнай падрыхтоўчай работы, якая ня ўсюды мела месца.

Буйнейшым недахватам зьяўляецца таксама і тое, што чыстка ня ўсюды праходзіла **адкрыта.** Бяз шырокага прыцягненьня мас да ачышчэньня апарату, без папярэднага шырокага растлумачэньня яе задач, толькі на падставе дакумантаў і паасобных допытаў адны кантрольныя і праверачныя камісіі бяз сувязі з масамі будуць бясьсільны выявіць імена тых, каго трэба вычысьціць. І сапраўды, як можна пры нягласнай чыстцы выкрыць вінаватых у скажэньні клясавай лініі? Такія «сакрэтныя» чысткі прадстаўляюць удзячную глебу для скарыстаньня чысткі ў інтарэсах склокі. Пры гэтым няўхільны неўгрунтаваныя пастановы і тым самым памяншэньне аўтарытэту чысткі.

Практыка паказвае, што там, дзе да чысткі былі прыцягнуты масы, апошнія аказалі вялікую дапамогу справе. Так, напрыклад, на Паўночным Каўказе ад беспартыйных рабочых і сялян Чорнаморскае акругі паступіла звыш 5.000 заяў і скаргаў.

Буйнейшым дэфэктам зьяўляецца невыстарчальны ўдзел у радзе месц партыйных і прафэсыянальных арганізацый у падрыхтоўцы і правядзеньні чысткі. Ячэйкі ў радзе выпадкаў стаяць у баку ад чысткі. Паасобныя камуністыя праяўляюць невыстарчальную актыўнасьць. Ня ўсюды ёсьць патрэбная мабілізацыя партыйнай грамадзкасьці вакол чысткі.

У сувязі з чысткай паўстае пытаньне аб тым, як адмежаваць апарат ад **прыёму назад вычышчаных.**

У радзе месц такія зьявішчы далёка не адзінкавыя. Зразумела, што зварот на работу вынганых з дзяржапарату пагражае зьвесьці на нішто ўсю работу, што робіцца на ачышчэньні апарату, і падрывае давер'е рабочых мас да чысткі. Трэба ўжыць рад мер, якія агарадзілі-б апарат ад прыёму назад вычышчаных, напрыклад, **апублікаваньне сьпісаў тых вычышчаных,** якім назаўсёды забаронена работа ў савецкім апараце, **адзнака ў працоўных сьпісах у выпадку забароны работы на тэрмін ці для пэўнага кола насад, выданьне спэцыяльнага закону,** які агараджае дзяржапарат ад пралазаньня вычышчаных і засьмечанасьці чужымі, шкодніцкімі элемэнтамі, і элемэнтамі, якія паказалі сваю пэўную непрыгоднасьць да работы ў савецкім апараце.

Зусім зразумела, што адных гэтых арганізацыйных мерапрыемстваў мала. Чужы і варожы элемэнт знойдзе спосабы падрыманьні паасобных працаўнікоў дзяржапарату нямала пічыін, каб вярнуцца зноў на работу ў савецкую ўстанову. Побач з арганізацыйнымі мерапрыемствамі патрэбен сыстэматычны кантроль над прыёмам на работу з боку саміх служачых, з боку прафэсыянальных і партыйных арганізацый, з боку рабочых, якія ажыцьцяўляюць кантроль над работай дзяржапарату.

**С. Ігнат**

(Канец будзе)

[1]) З артыкулу, надрукаванага ў часопісі «Большавік» № 8.

2) «Лучше меньше, да лучше», 1923 г. XVIII, ч. 2 ст. 126.

3) Там-жа.

## ВОСЬ ЯК ПРАЦУЕ НАВАСЁЛКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

### Дрэнная арганізацыя работы у сельсавеце—галоўная прычына цяганіны і бюракратызму

### (З матар'ялаў абсьледваньня ЦКК-РСІ Навасёлкаўскага сельсавету, Пухавіцкага раёну, Менскай акругі)

Ня будзем спыняцца на рабоце сельсавету старога складу. Якою была гэта работа, можа кожны ўявіць, калі будзе ведаць, што яшчэ за доўгі час да перавыбараў і старшыня **Сіротка**, і сакратар **Сямашка** былі зьняты з работы і аддаены пад суд за «добрыя ўчынкі».

Спынімся на рабоце Навасёлкаўскага сельсавету новага складу, які працуе ўжо 4 мес. Старшыня савету—жанчына—ведьмі энэргічная і здольная, аддамая савецкаму будаўніцтву; сакратар і справавод ня кепскія таксама. Як-жа ідзе работа савету, як яна пастаўлена? Вось пацікавімся.

З прычыны таго, што **не разьмеркавана работа** паміж супрацоўнікамі, тармозіцца ўся работа, сяляне доўга чакаюць, пакуль атрымаюць патрэбную справку або вырашэньне тэй ці іншай справы, бо старшыня і справкі піша, і рэгіструе іх на журнале і прымае наведвальнікаў. У гэты час сакратар і справавод, ня маючы пэўнай работы, сядзяць і дапамагаюць «слухаць», або робіць якую-небудзь вырабку

Ад Акруговай Камісіі Садзейнічаньня Дзяржкрэдыту

17 мая, у пятніцу, а 18½ гадз. у клюбе „САУГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ“

## АДБУДЗЕЦЦА НАРАДА

старшынь камісій садзейнічаньня дзяржпазыкам, старшынь фабзаўмясцкомаў усіх прадпрыемстваў і ўстаноў гораду Менску, з удзелам рабкораў,

па пытаньні

## ўстрыманьня ад продажу аблігацый трымацелямі

Пасьля нарады—спэктакль «Воўчая трапа».

Просьба не пазьвіцца, бо роўна а 19-й гадзіне ўваход будзе зачынены.

Уваход па даведках фабзаўмясцкомаў.

# МЕНСК

## Выплата выйгрышаў па II пазыцы індустрыялізацыі

У Галоўнай касе ашчадкасьці выплачана 415 выйгрышаў на суму 15.194 р., з якіх 2|5 аблігацый па 1.000 р.

У 5-м аддзяленьні Галоўнай касы ашчадкасьці (на Ляхаўцы) выплачана 115 выйгрышаў на 3.475 р., з іх 2|5 аблігацыі па 1.000 р. Адзін выйгрыш атрымалі рабочыя заводу „Эвэргія“ і адзін—рабочы заводу «Бальшавік», 8 выйгрышаў было па 250 р.

## Рабочыя Меншвэю выступілі першымі

Пядаўна адбылася агульна - фабрычная канфэрэнцыя рабочых Меншвэю, на якой быў зроблены даклад аб значэньні дзяржаўных пазык.

Канфэрэнцыя аднагалосна пастанавіла: паложаныя ў аблігацыі пазыкі сродкі аддаць на доўгатэрміновае карыстаньне дзяржаве, на патрэбы гаспадарчага і культурнага будаўніцтва ў краіне.

Рабочыя Меншвэю таксама зьвярнуліся з заклікам да іншых рабочых ўзяць з іх прыклад.

## Адкрыўся летні спартыўны сэзон

12-га мая на спорт-пляцоўды «Прафінтэрн» адкрыўся летні спартыўны сэзон 1929 г.

Было праведзена 15 спартыўных гульняў,—па футболе, баскетболе і волейболе.

Вынікі па футболе: металісты—МБВч—1:0 у карысьць МБВч; каманды №-й кавалерыйскай дывізіі—БДУ 2:2, па баскетболе: будаўнікі — саўгандальслужачыя 29:17 у карысьць саўгандальслужачых; жаночыя каманды саюзу сувязі—МБВч 28:6 у карысьць МБВч; па волейболе мужчынскія каманды швэйнікаў—гарбароў 30:16 у карысьць швэйнікаў; жаночыя каманды дому камсамолу—БДУ 8:30 у карысьць БДУ.

## Новыя электрастанцыі ў мястэчках

1-га мая ў мястэчку Заслаўе Менскай акругі пушчана новая электрастанцыя магутнасьцю ў 40 клв. Беларускае аддзяленьне Электратэхнічнага трэсту заканчвае пабудову новых электрастанцый у м-нах Капыль і Плешчаніцы, гэтыя станцыі будуць пушчаны да 1 чэрвеня.

## Вялікі лясны пажар

13 мая ў раёне Трасьцянка (12 вёрст ад Менску), на тэрыторыі ў 60 дзесяцін здарыўся вялікі лясны пажар. На месца пажару выяжджалі начальнік гарнізону тав. Цімашэнка, тав Лакшёнаў, намесьнік старшыні гарадзкога савету, тав. Крузмат. Пажар тушылі сапёрныя і іншыя вайсковыя часьці. Разьмер страт і прычына пажару выясьняюцца.

## Акруговая нарада па пытаньнях працы

У Менску пры акруговай інспэкцыі працы адбылася нарада ўпаўнаважаных па сацыяльным страхаваньні і ахове працы. Нарада заслухала даклады аб далейшых задачах работы ўпаўнаважаных па працы; аб арганізацыі працы батрацтва і сацыяльным страхаваньні батрацтва, аб фінансавым становішчы органаў сацыяльнага страхаваньня і інш.

## Швэйнікі заключаюць сацыялістычны дагавор

Фабрыкі Меншвэй, Вітшвэй і Гомшвэй заключаюць паміж сабою гаспадарча-палітычны дагавор. У Менск прыедзе дэлегацыя Вітшвэю, якая зробіць інфармацыю аб праецце і ўмовах дагавору. Такую-ж дэлегацыю накіруюць у Віцебск менскія швэйнікі.

**************************

**************************

## Пуск 6-й машыны на Добрускай фабрыцы паперы

**На Добрускай фабрыцы паперы «Гэрой працы» скончана ўстаноўка 6-й машыны. Машына будзе пушчана першага ліпеня. У зьвязку з гэтым вытворчасьць фабрыкі павялічваецца амаль на 100 проц. Добруская фабрыка будзе выпушчаць штодзенна 70 тон паперы. Пры фабрыцы пачынаецца пабудова новага цэлюлёзнага заводу.**

## Зьмены аўтабусных маршрутаў

Па Савецкай вуліцы паміж мастом Эльводу і вуліцай Энгельса пачаліся трамвайныя работы. Вядзецца таксама падрыхтоўка да зрэзкі гары па Савецкай вуліцы.

У зьвязку з трамвайнымі работамі зьменены маршруты аўтабусната руху: аўтабусы лініі таварная — Камароўка ідуць па маршруце пляц Волі—Шырокая—Мопраўская—Камароўка. Аўтабусы —Пярэспа—Серабранка ідуць праз Камунальную вуліцу.

## Пачалася пабудова рабочых пасёлкаў

На ўсіх пабудовах Белжылсаюзу пачаліся будаўнічыя работы. Сёлета найбольш значнае кватэрнае будаўніцтва будзе вясьціся ў Гомелі і Віцебску. У Віцебску будуюцца два дамы па 40 кватэр кожны.

У Менску распачаліся работы ў пасёлках «Камінтэрн», «Камвузавец», «Іскра». Матар'ялямі будаўніцтва забясьпечана.

## Раённыя канфэрэнцыі настаўнікаў

У чэрвені па ўсёй Беларусі будуць праведзены вытворча-прафэсіянальныя канфэрэнцыі настаўнікаў, на якіх будуць падведзены вынікі бягучага навучальнага году. У рабоце канфэрэнцыі прыме ўдзел рад членаў прэзыдыуму ЦП саюзу працаўнікоў асьветы.

## Менскія шахматыстыя ў Ленінградзе

Па выкліку Ленінградзкага абласнога савету прафсаюзаў у Ленінград выехала прафсаюзная каманда менскіх шахматыстых-шашачнікаў для таварыскіх сустрэч-спаборніцтваў.

У склад каманды ўваходзіць 11 чалавек, з якіх 5 рабочых.

У Ленінградзе менская каманда прыме ўдзел у шашачных спаборніцтвах з наймацнейшымі ленінградзкімі саюзамі і.

## БЯСПРЫТУЛЬНЫЯ ЧАКАЮЦЬ ДАПАМОГІ

У сучасны момант у БССР ёсьць 86 дзіцячых дамоў, у якіх знаходзіцца 6.070 дзяцей. На ўтрыманьне іх па дзяржаўным і мясцовым бюджэтах адпушчецца каля 1.500.000 руб., або 250 руб. на кожнага выхаванца.

Галоўная задача дзіцячага дому выхаваць фізычна здаровага падростка, даць яму агульную асьвету і падрыхтаваць да самастойнага працоўнага жыцьця.

У мэтах найлепшага абслугоўваньня дзяцей розных нацыянальнасьцяй, арганізаваны нацыянальныя дзіцячыя дамы, дзе ўся праца сярод дзяцей праводзіцца на роднай мове.

На дапамогу справе барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю прышла шырокая савецкая грамадзкасьць:

былі ўтвораны дзіцячыя камісіі пры выканкомах. Трохі пазьней арганізавалася т-ва «Прыхільнік Дзяцей».

У мінулым годзе па БССР быў праведзены месячнік дапамогі бяспрытульным дзецям, у часе якога падабрана з вуліц і накіравана ў дзіцячыя ўстановы звыш 500 бяспрытульных дзяцей.

У сучасны момант т-ва «Прыхільнік Дзяцей» налічвае ў БССР 25.000 членаў і 370 ячеек.

Асноўным пастаўшчыком дзіцячай бяспрытульнасьці цяпер зьяўляецца вёска і мястэчка. Дзякуючы аграрнаму перанасяленьню, слабаму культабслугоўваньню дзяцей, падросткі, не знаходзячы прымяненьня сваім сілам, ідуць у горад і пападаюць у рады бяспрытульных дзяцей.

Матар'ялы, якія маюцца ў Цэнтр Дзіцяч. Камісіі, сьведчаць, што некаторыя саветы і выканкомы праводзяць зусім слабую работу ў барацьбе з дзіцячай бяспрытульнасьцю.

Так, напр., у 14 вярстох ад Шклоўскага РВК, на тэрыторыі Каменна-Лоўскага сельсавету, знаходзіцца Барсукоўская дзіцячая калонія з 40 выхаванцамі. Кіраўнікі калоніі, у якой ёсьць амаль новыя будынкі, так безгаспадарча і злачынна кіравалі гаспадаркаю, што давялі яе да поўнага развалу. Дзеці—голыя і босыя; пасьцельнай бялізны зусім няма. Дзеці сьпяць по двое, а некаторыя каля жалезнай печы, сумесна з цялятамі, якіх трымалі ў інтэрнаце ўзімку. Падлога ва зіму ня мылася ні разу. Харчаваньне вельмі дрэннае.

Слабы нагляд за жыцьцём дзіцячых дамоў з боку саветаў і выканкомаў ёсьць і ў іншых мясцох.

Трэба ў барацьбу з дзіцячай бяспрытульнасьцю ў вёсцы шырэй прыцягнуць грамадзкія арганізацыі, камітэты сялянскай узаемадапамогі, т-вы «Прыхільнік Дзяцей», якія павінны быць арганізаваны ў кожным сельсавеце і ў буйных вёсках, каапэрацыю і інш. Гарадзкія і сельскія саветы, раённыя і акруговыя выканаўчыя камітэты, павінны стала і сыстэматычна праводзіць кіраўніцтва справай барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю, ставіць гэтае пытаньне на абгаварэньне пленуму і прэзыдыуму.

К. МУРАШКЕВІЧ.

## Вячэрнія школы на фабрыках і заводах

ЦП саюзу хэмікаў адпусьціў 5 тыс. р. на арганізацыю вячэрніх прафшкол на заводах «Дняпро», «Вязуві», «Домбаль», Кастрычнік» і інш. прадпрыемствах. У школы будуць уцягвацца рабочыя ад варштату—прафактывістыя,

МАКК просіць зьвяцца на пасяджэньне партпройкі, якое адбудзецца 15 мая 29 г. а 6 з пал. гадз. увечары ў памяшканьні малай залі клюбу К. Маркса па вул. Энгельса наступных таварышоў: Ожэ—яч. службы шляхаў, Малініна—яч. УМТ, Корзуна-Залескага—яч. Дэпо, Астаповіча—яч. сп. руху МБВ, Каца Шэпшлак—яч. зав. «Бальшавік», Фельдмана—яч. шчотачн. ф-кі, Месара—яч. зав. «Бальшавік», Бухвальтора—яч. ЦІП, Баранава—яч грузчыкаў, Зайдгафт—яч. зав. «Бальшавік», Рабіновіча—яч. абуткавай ф-кі, Столяра—яч. Меншвэя, Маліньнікава—яч. Саюзхлебу, Цэхановіча—яч. шпалернай ф-кі, Гатаўшчыка—яч. Беларку, Зусіну—яч. Меншвэй, Балашова—яч. зав. „Камунар“, Крэйвіц—яч. хлебазаводу, Барскоўскага—яч. Міліцыі.

Просьба ўсіх таварышоў, а таксама сакратароў ячеек КП(б)Б, таварышы якіх выклікаюцца на пасяджэньне партпройкі,—зьявіцца абавязкова і без спазьненьня.

# Кампанія па самаабкладаньні канчаецца---

## ТРЭБА ПАДЛІЧЫЦЬ ВЫНІКІ

**Замест 2 з паловай мільёнаў рублёў, прынятых на сялянскіх сходах, спагнана толькі паўтары мільёны рублёў.—У Гомельскай акрузе самаабкладаньне зусім правалена.—Сабраныя грошы затрымліваюцца ў касах і не выдаткоўваюцца на вызначаныя мэты.—Дзеяньні, якія кампрамэтуюць ідэю самаабкладаньня ў вачох сялянства.—Трэба максымальна скарыстаць пэрыяд часу, што застаўся**

Пачалася ўжо сяўба, сяляне з галавой уходзяць у палявыя работы і кампанія па самаабкладаньні натуральна заканчваецца. Таму час падвесьці вынікі самаабкладаньня хоць-бы ў няпоўным відзе.

Агульная сума па самаабкладаньні, прынятая на сялянскіх сходах, складае звыш 2 з паловаю мільёнаў рублёў (22 проц. у адносінах да сумы абкладаньня па с.-г. падатку). Гэта сума, якую нельга лічыць мізэрнай, гаворыць аб тым, што сялянства ў агульнай масе аднеслася добра і спачувальна да справы самаабкладаньня.

Але вось са спагнаньнем гэтых вызначаных сум справа значна горш. Да 1-га мая было сабрана толькі паўтары мільёны рублёў. Гэтага мала, гэта далёка невыстарчальна.

Праўда, некаторыя акругі за апошні час падцягнуліся. Так, Аршанская акруга сабрала 84 проц. усёй сумы па самаабкладаньні, Віцебская акруга—78 проц., Мазырская—73 проц. Але ў іншых акругах спагнаньне сум пашло горш. Трэба асабліва адзначыць Гомельскую акругу, дзе сабрана ўсяго 22 проц. агульнай сумы. Можна сказаць, што Гомельская акруга праваліла кампанію па самаабкладаньні. Для даволі багатай Гомельскай акругі, дзе і ўраджай у мінулым годзе быў добры, такія сумныя вынікі нічым ня могуць быць апраўданы.

Даволі цікава і карысна было-б абсьледаваць сельсаветы і асобныя населіпчы ў сэнсе правядзеньня там самаабкладаньня. На жаль, такія абсьледаваньні, якія нам далі-б каштоўны матар'ял на будучы час, у нас не праводзіліся. Тут было дапушчана адно толькі выключэньне—абследавана вёска Вялікія Бортнікі (Бабруйскага раёну) у адносінах с.-г. падатку і самаабкладаньня. І вось выявілася, што ў гэтай вялікай вёсцы да часу правядзеньня абследаваньня (красавік месяц) было спагнана па самаабкладаньні... 4 руб абсьледаваньне выявіла. што ў гэтай вёсцы сход па самаабкладаньні быў скліканы са значным спазьненьнем, што затрымала тэхнічную работу па разьмеркаваньні паміж асобнымі гаспадаркамі налічаных па самаабкладаньні сум. З другога боку выявілася, што ў вёсцы ня вызвалены ад самаабкладаньня (у грашовай форме) нават тыя беднякі-сяляне, якія зусім вызвалены ад с.-г. падатку. У выніку мы мелі такія агідныя недапушчальныя зьявішчы, як выпісваньне акладных лістоў на суму... у пяць кап. і нават тры кап. Такія-ж факты там назіраліся і ў галіне сельска - гаспадарчага падатку, калі выпісваліся акладныя лісты на суму да 1 руб., ня глядзячы на тое, што паводле закону, такія дробныя сумы трэба адкідаць і не спагнаць.

Можна сказаць упэўнена, што тыя ненармальнасьці, якія выяўлены ў вёсцы Вялікі Бортнікі, не адзінкавыя і назіраюцца ў шмат якіх вёсках.

Ёсьць яшчэ адна акалічнасьць, якая шкодна адбіваецца на кампаніі па самаабкладаньні. Гэта слабое, маруднае выдаткаваньне тых сум, якія ўжо спагнаны па самаабкладаньні. Зводка на 1-га мая гаворыць аб тым, што з агульнай сумы спагнаных грошай у паўтары мільёны рублёў, выдаткаваны пакуль што якія-небудзь 300.000 рублёў. Такая сума зьяўляецца надзвычайна мізэрнай і не паддаецца тлумачэньню, калі прыняць пад увагу вялікую і вострую патрэбу ў арганізацыі рознастайных культурна-бытавых устаноў для патрэб сялянства. Між тым, такое маруднае выдаткаваньне сабраных грошай зусім паслабляе эфэкт ад самаабкладаньня і мае дрэнны ўплыў на настроі сялянства.

Часу ўжо засталося зусім мала і трэба, нарэшце, напружыць намаганьні, каб выправіць становішча з самаабкладаньнем. А галоўнае мы павінны самым рашучым чынам адзёрнуць тых працаўнікоў, якія сваімі дзеяньнямі кампрамэтуюць самую ідэю самаабкладаньня ў вачох сялянства.

Л. НЯФЭДАЎ.

# Гнаць хаўтуру з савецкай эстрады

(Кіно „Спартак“)

Звычайна, у кіраўнікоў кіно-тэатрамі ёсьць такая тэндэнцыя: калі фільм ня вельмі ўдалы, яго трэба дапоўніць, «жажывіць» эстрадным выступленьнем якога-небудзь коміка, фэльетаністага, сьпявачкі і г. д.

Часта гэта «мерапрыемства» апраўдвае сябе і сапраўды «кампэнсуе» глядача няўдалага фільму.

Аднак, калі ў дадатак да дрэннага фільму глядача прымушаюць яшчэ выслухаць якога-небудзь халтуршчыка «коміка», дык гэта ўжо сапраўдны зьдзек.

Аб якасьці фільму «Прастытутка» мы нерагаварвацца ня будзем. Гэта карціна ў свой час была ацэнена.

Цяпер зноў «Прастытутку» дэманструе кіно «Спартак». Мы сьнынімся на дадатках да фільму, якімі адміністрацыя кіно «Спартак» зараз кампэнсуе глядача.

Гэта выступленьне сьпявачкі Н. Ронскай і «фэльетаністага-сатырыка» (як яго называць у рэклямах) Уладзімера Гурскага.

Калі сьпевы Ронскай з грахом напалам яшчэ як-небудзь слухаюцца пры агульным зяваньні аўдыторыі, дык рэпэртуар «фэльетаністага» Гурскага выклікае вялікае абурэньне слухача сваёй пахабшчынай. Падамо для прыкладу некалькі вынятак з ягонага «рэпэртуару». У адным з «нумароў» Гурскі сьпявае:

«И гостей из дальних стран,
Что-б не шлялись по Европе
Проста дали всем по...

Тут «сатырык» ударае сябе «па адпаведнаму месцу» і каб некалькі «загладзіць» уражаньне кончае:

«по шапке... во!
И больше ничего»...

Далей ідуць яшчэ такія «пэрлы»:

«Тишина.
Перад грозой замирает страна,
Из темного леса вылазит шпана...

і інш., і інш.

Лічым, што гэтых вынятка ў досыць, каб ацаніць ідэалёгічную «вартасьць» выступленьняў Гурскага.

Мы пытаемся, ці ня час ужо пагнаць з савецкай эстрады розных халтурыстых і пахабшчыкаў.

С. ГАЛКІН.

# Антысанітарнае становішча камгасаўскіх дамоў

Ужо не адзін раз пісалася ў газэтах аб тым, што амаль усе дамы, якія належаць камгасу, знаходзяцца ў вялікім антысанітарным становішчы. На дварох камгасаўскіх дамоў валяецца розны бруд, не ачышчаны памыйныя ямы або зусім яны адсутнічаюць, памыі і розны бруд выліваецца ў раку Сьвіслач і г. д.

Досыць прывесьці некалькі прыкладаў, якія яскрава паказуюць антысанітарнае становішча камгасаўскіх дамоў. Напрыклад: па Нова-Маскоўоніім зав. у доме № 16 пражывае 40 чал. Уборная амаль зусім згніла, пахілілася на бок і звыш году на чысьцілася. У яе боязна, нават, хадзіць. Двор таксама ніколі ня чысьціцца, пэд нагамі валяецца розны бруд.

Па Северным завулку ў доме № 14 пражывае 15 чал. Уборная ніколі ня чысьціцца і зусім развалілася. Памыйная яма запружана і ня чысьціцца. Некалькі раз падаваліся заявы ў камгас. але... вынікаў ніякіх.

Па Стара-Віленскай вул. у доме № 9 пражывае звыш 50-60 чал. На дварэ брудна. Памыі і розныя начысты выліваюцца проста ў раку. Рака на гэтым дварэ замяняе памыйную яму.

Камгасу і санітарнай камісіі неабходна ў тэрміновым парадку заняцца аглядам камгасаўскіх дамоў, вінаватых у антысанітарным становішчы паказаных дамоў, прыцягнуць да адказнасьці.

У. Б.

# СПЭЦЫЯЛІСТЫЯ і СЯЛАНСТВА

## павінны ведаць дасягненьні нашых дасьледчых станцый

Роля дасьледчае справы ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі надзвычайна вялікая. Да рэвалюцыі, як вядома, мы ў Беларусі, бадай, ня мелі ніякіх дасьледчых устаноў. У 1840 г. у Горках было заснавана Стэбутаўскае дасьледчае поле. У 1864 г. графам Мураўёвым былі зьнішчаны на Беларусі «першыя пачаткі сельска-гаспадарчага досьледу і агранамічнае асьветы».

Сацыяльная рэвалюцыя прынесла Беларусі разам з палітычным і эканамічным вызваленьнем працоўных сапраўдны росквіт дасьледчае працы. Арганізуецца рад дасьледчых станцый, якія на чале з навукова-дасьледчым інстытутам сельскае і лясное гаспадаркі імя Ў. І Леніна, стараюць моцны грунт для разьвіцьця навукова-дасьледчай працы на ўсіх галінах сельскае гаспадаркі. Арганізацыйны пэрыяд раду станцый яшчэ, на жаль, ня скончаны, ала кожная станцыя ўжо мае ў сваёй працы пэўныя вынікі. Вось аб скарыстаньні гэтых вынікаў і хочацца нам сказаць некалькі слоў.

У дарэвалюцыйныя часы, у старой Расіі, калі агранамічныя чыноўнікі ад дасьледчае справы вялі працу «пастольки-наколькі», калі царскі ўрад быў не зацікаўлены ў росквіце дасьледчае працы, зусім зразумела, што вынікамі гэтае дасьледчае працы ніхто ня цікавіўся. Імі карысталіся абшарніцкія гаспадаркі, а наконт таго, каб выкарыстаць гэтыя досьледы ў сялянскіх гаспадарках, не магло быць і гутаркі. Сыстэма барбарскай эксплёатацыі сялянства ў дарэвалюцыйныя часы якраз і была зацікаўлена ў найбольшай цемнаце сялянства. Гэта спрыяла максымальнай эксплёатацыі сялянства і адпавядала ўсёй сыстэме паліцэйскага рэжыму. Нават найбольшыя энтузіясты часоў росквіту старой земскай агранаміі нічога не змаглі тут зрабіць. Досьлед па сельскай гаспадарцы, вынік досьледу ў лепшым выпадку застаўся адначываць у спэцыяльным выданьні (апошнія выходзілі дужа малым тыражом), а ў горшым, як гэта здарылася на абшарах Беларусі, ляжаў не распрацаваным. Мы маем прыклады, якія выразна гэта сьцьвярджаюць. На Горацкай фэрме «з 1836 г. аж да сучаснасьці захаваны рахункаводны матар'ял». Матар'ялы Стэбутаўскага дасьледчага поля да гэтага часу не надрукаваны, як не надрукаваны і матар'ялы Горацкай фэрмы. З апошнімі, паміж іншым, абыходзяцца ня дужа ветла, бо, як кажа праф. Пэлехаў, архіў Стэбутаўскага дасьледчага поля і Горацкае фэрмы «после от'езда из Горок проф. Винера был использован не совсем по назначению: им в продолжении одной зимы растапливались печи работников Академии, живущих на ферме, поэтому архив во многом не полон и сильно разрознен, отчеты за некоторые годы уже сожжены».

Дужа шкода, што пасьля рэвалюцыі знайшліся людзі, якія так неразумна аднесьліся хоць і да гістарычнага ўжо, але бязумоўна каштоўнага для нас матар'ялу. Будзем спадзявацца, што знойдуцца таксама і людзі, якія інакш адносяцца да гэтай справы і прымуць рашучыя крокі да апрацоўкі і надрукаваньня матар'ялаў першых дарэвалюцыйных дасьледчых устаноў ня толькі на абшарах Беларусі, але і ўсёй былой Расіі.

Ну, а як-жа з вынікамі працы нашых дасьледчых станцый. Як мы ўжо казалі, кожная з іх мае тыя ці іншыя вынікі. На жаль, аднак, гэтыя вынікі не публікуюцца да шырокага ведама, і бадай уся наша мясцовая агранамія працуе ў цёмную. Ёй, натуральна, добра вядомы тэарытычныя падставы разьвязаньня таго ці іншага пытаньня ў сельскай гаспадарцы. Але, ня маючы навуковага ўгрунтаваньня на аснове мясцовага досьледу беларускіх дасьледчых станцый, аграномам прыходзіцца ў большасьці разважаць наогул. Гэта было адным з самых слабых месц працы нашых агранамаў.

Таму асабліва трэба вітаць вышаўшую нядаўна з друку кніжку **М. Савіцкага** «Галоўныя вынікі работы раённых с.-г. дасьледчых станцый БССР у галіне рольніцтва» (за 1924-1928 г.). Ініцыятарам выданьня зьявіўся ў даным выпадку **СНК БССР**, які ў сваёй пастанове ад 12 сьнежня 1928 г. прапанаваў: **«Народнаму Камісарыяту Зямляробства скарыстаць у веснавую пасеўную кампанію бягучага году вынікі зробленых досьледаў у сельскай гаспадарцы БССР за мінулыя гады».**

Праца т. Савіцкага падводзіць вынікі на асноўных мерапрыемствах, якія маюць вялікае значэньне ў справе павышэньня ўраджайнасьці. Падрабязна разглядаюцца: уплыў розных угнаеньняў (гной, лубін, торф, мінэральныя ўгнаеньні, попел і вапна), уплыў шматпалёвых севазваротаў, занятыя папары, апрацоўка глебы, гатунковае насеньне.

Спэцыялістаму ды нават кожнаму, хто цікавіцца сельскай гаспадаркай, тут будзе многа чаго цікавага і карыснага для скарыстаньня ў штодзённай працы. Вялікі тыраж (10.000 экзэмпляраў) і не дарагая цана (40 кап). спрыяюць распаўсюджаньню працы т. **Савіцкага.** Варта толькі, каб спэцыялістыя далі ў друк хутчэй свае водзывы і належныя рэцэнзіі аб гэтай працы. Гэта патрэбна для шырокага скарыстаньня кніжкі ў практычнай працы па павышэньні ўраджайнасьці.

Але выхад кніжкі т. Савіцкага ня можа нас супакоіць. Дырэктар навукова-дасьледчага інстытуту т. Г. І. Гарэцкі ў свой час пісаў:

**«Напрамку на масавасьць правядзеньня досьледаў павінен адпавядаць напрамак на масавасьць пашырэньня вынікаў дасьледчых устаноў. Навуковыя справаздачы дасьледчых устаноў павінны своячасова друкавацца, а не залежвацца ў архівах. А між тым маладыя дасьледчыя ўстановы БССР ужо маюць «залежы» ненадрукаваных прац: Горацкая дасьледчая станцыя, Менская, Н. Д. І. і гэтак далей. Выдрукаваныя працы некаторых дасьледчых станцый для эканоміі на друку страшэнна скарочаны, даведзены проста да канспэкту, напрыклад, па Горацкай станцыі».**

Думка т. Гарэцкага пакуль што не атрымала шырокага ажыцьцяўленьня. Нашы дасьледчыя станцыі, як і НКЗемляробства, пакуль што нічога не зрабілі ў справе таго, каб сапраўды дабіцца масавасьці пашырэньня вынікаў дасьледчых устаноў».

Чакаць далей нельга і трэба зараз ужо практычна працаваць, каб апублікаваць вынікі працы нашых станцый.

З тэм, якія ў першую чаргу трэба падсумаваць і, надрукаваўшы, распаўсюдзіць, на наш погляд будуць наступныя:

1) **Поўная зводка ўсіх досьледаў з угнаеньнямі на Беларусі**

Зводка павінна складацца на падставе досьледаў дасьледчых станцый БССР за 1924-28 г. сумежных дасьледчых станцый—Энгельгардаўскай, Новазыбкаўскай, Радамысьлянскай, Туганавіцкага дасьледчага поля, калектыўных досьледаў на абшарах Беларусі за даваенны час і досьледаў інстытуту сялян дасьледчыкаў за 1926-28 г.

Зводка павінна ахапіць усе віды ўгнаеньня—гной, лубін, торф, мінэральныя ўгнаеньні (попел і вапну) пад усе культуры.

2) **Хэмізацыя сельскае гаспадаркі БССР.**

Гэта праца павінна ахапіць пытаньні ўгнаеньня ва ўмовах БССР, балянс пажыўных матэрый і пытаньне аб сыстэмах угнаеньня ва ўмовах БССР.

3) **Галоўныя вынікі работы дасьледчых станцый БССР па асобных культурах,** уключаючы сюды і кармовыя расьліны (за 1924-28 г.).

4) **Галоўныя вынікі работы дасьледчых станцый БССР па спэцыяльных галінах** (садоўніцтва, гародніцтва, сэлекцыя і насеннаводства, аграхэмія, фітапаталёгія, машыноспрабаваньне, лекавыя расьліны, лугаводзтва, жывёлагадоўля, культура балот, за 1924-28 г.).

5) **Шляхі насеннаводнае справы БССР.**

**Арганізацыя, эканамічнае значэньне і разьмеры насеннаводнай справы.** Задачы насеннаводнай справы па кожнай культуры.

6) **Вынікі сортаапрабаваньня ва ўмовах БССР за 1926-29 г.** (па аўсе, ячмені, жыце, зімовай пшаніцы, бульбе, кораньплодах і ільну).

Вось найбольш актуальныя пытаньні, па якіх зараз-жа трэба падвесьці вынікі працы. Гэтыя вынікі павінны быць даведзены як да спэцыялістых, так і шырокіх колаў сялянства.

Праўда, паўстане пытаньне аб сродках. Але калі мы на дасьледчую працу даем сотні тысяч рублёў, то хіба ня можна знайсьці некалькі тысяч рублёў, каб скарыстаць вынікі досьледаў у сельскай гаспадарцы, хутчэй апублікаваўшы іх. Інакш трэба адкрыта сказаць, што мы будзем весьці досьледы для досьледаў, што і ў дасьледчай працы пачынаецца пэрыяд «мастацтва для мастацтва».

НЕСПЭЦЫЯЛІСТЫ

## Паведамленьні

**Назначаная на 12 мая нарада старшынь жэнсэкцый шэфтаварыстваў Фрунзаўскага раёну пераносіцца на 15 мая на 6 г. вечару ў памяшканьне Фрунзаўскага РК КП(б)Б.**

**Парадак дня:**

**Аб ясельнай кампаніі, аб прыцягненьні адпускнікоў для працы ў вёсцы, арганізац. пытаньні, бягучыя справы.**

**Яўка старшынь і жэнсэкцый шэфтаварыстваў, райшэфбюро абавязкова.**

**— ДОМ АСЬВЕТЫ. З 22 мая г. г. адчыняецца дзіцячая пляцоўка для дзяцей сяброў саюзу. Запіс у Доме штодня (11—2 і 6—9 г.) да 20 мая. Раздаюцца білеты на адчыненьне саду (субота 18-V).**

**— У сераду 15 мая а 7 гадз. ўвечары адбудзецца сход выкладчыкаў і слухачоў 2-га куроу вячэрняй саўпартшколы па пытаньні падвядзеньня вынікаў работы за 1928-29 навучальны год.**

**Запрашаюцца апоргі ячэек.**

**— ВАЙСКОВЫ ГАБІНЭТ БДУ. Дадатковы мэдыцынскі агляд студэнтаў 1, 2 і 3-га курсаў,—1901 году і моладзей, прызначаецца на 15 і 16 мая ад 9 гадз. раніцы у вайсковым габінэце. Агляд павінны прайсьці студэнты, якія атрымалі адтэрмінаваньне да вясны і не прайшлі мэдыцынскай камісіі.**

## Адказы чытачом

**Рэзьніку С.—На ваша запытаньне адказваем, што фабрыка па выробе шапак у Менску будаваецца яя будзе**

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ


ТЭАТР і КІНО

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
Серада, 15 мая, для пралетэтуду
„КАСТУСЬ КАЛІНОЎСКІ“
Пачатак а 8 гадз. увеч.

КІНО Інтэрвацыяна
Кіно-рэв'ю ШКЛЯНОЕ ВОКА
Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз.

КІНО Пралетары
Ад аўторка 14 мая ЗЬВІНІГАРА
Пачатак а 7 г. 15 м. Каса—ад 6 г.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр Юны піянэр (будынак кіно „ПРАЛЕТАРЫ“)
АД АЎТОРКА, 14 МАЯ СТЭНЛЕЙ У ГЛЫБІ АФРЫКІ апошняя 4-я сэрыя ў 9 частк.
Пачат. 1-га сэансу а 3 гадз. дня.

Кіно-сад Чырвоная зорка Савецкая, 71.
Адчыненьне скора! НА ЭКРАНЕ Асусьветны амэрык. фільм
Сачэце за рэклямай!!!

КІНО Спартак
Звыш праграмы выступленьне вынаг. інтымных і дзіцячых сьпевак фэльетаністага-сатырыка на экране выдатны фільм канцэртнае аддзяленьне Н. В. Ронскай Уладзімера ГУРСКАГА
ПРАСТЫТУТКА драма ў 7 част.

ДА ВЕДАМА ПАДПІСЧЫКАЎ НА ТВОРЫ ЛЕНІНА НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ па гор. Менску
Белдзяржвыдавецтва даводзіць да агульнага ведама падпісчыкаў на творы Леніна на беларускай мове па гор. Менску, што яны могуць атрымаць вышаўшы з друку III-ці ТОМ ТВОРАЎ ЛЕНІНА ШТОДНЯ З 9-ці ДА 4-х ГАДЗ. ДНЯ, за выключэньнем дзён адпачынку, у памяшканьні бюро падпіскі кніга поштай.
Пляц Волі, д. № 5, у панадворку. БЮРО ПАДПІСКІ.

МЭДЫЦЫНСКА-ХІРУРГІЧНАЯ ВЫСТАЎКА БЕЛМЭДГАНДЛЮ У ДОМЕ СЕЛЯНІНА
Адкрыта для агляду ў экскурсыйным парадку па аўторках і чацьвярогах ад 5--7 гадз. увеч., а па нядзелях ад 10—2 гадз. дня.
Запіс экскурсантаў прымаецца ў Белмэдгандлі Пляц Волі, д. № 29.

ТОРФМЕЙСТАР тэрмінова ПАТРАБУЕЦЦА
БЕЛДЗЯРЖСЬПІРТУ
АКЛАД З ЦЬВЁРДЫМІ КАМАНДЫРОВАЧНЫМІ
160-180 руб. у месяц.

ТАРГІ
Сельска-гаспад. калёнія „РАСЬСЬВЕТ“ абвяшчае на 19 мая таргі
на здачу ў арэнду ў 1929 г. САДУ, плошчаю ў 2,67 гект.
Таргі адбудуцца а 12 гадзіне дня ў калёніі «Расьсьвет» (Навадворскі сельсавет, вёска Пашковічы).
Жадаючыя ўдзельнічаць у таргох павінны ўнесьці залог у разьмеры 10 проц. з сумы первічнай ацэнкі саду
Агляд штодзенна з 8 г. раніцы да 8 г. увеч.
Калёнія «Расьсьвет».

ЛЯЧЭБНІЦА МЕНСКАГА ЎЎ РЭЙСКАГА МЭДЫЦЫНА-САНІТАРН. Т-ВА
Ленінская (побач з 2-м Домам Савецтаў), № 25, тэл. 12-66
АДКРЫТА ад 3 г. дня да 9 г. ув.
Прыём па ўсіх спэцыяльнасьцях: унутраных, жаночых, зубных, вока, нервоў, вуха, горла, носа і скуры
Фізіятрычны габінэт: кварц, электра і сьвета-лячэньне.
Рэнтгенаўскі габінэт робіць здымкі, прасьвечваньні і лячэньне хворых
Прыём хоміка-бактэрыял. аналізаў
Кансультацыя прафэсароў—прыём хворых на лекавых кніжных таварыства.
Для ўсіх іншых грамадзян за агульна-даступную плату.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2-ое гадзіны дня

ЗЬВЯЗДА
ФОТО-ЦЫНКАГРАФІЯ
ПРЫМАЕ ЗАКАЗЫ
НА КЛІШЭ
ШТРЫХОВЫЯ, ТОНАВЫЯ СЕТКА
МАСТАЦКАЕ ВЫКАНАНЬНЕ РЫСУНКАЎ
З ЗАКАЗАМІ = ЗВАРОЧВАЦЦА У ГАЛОЎНУЮ КАНТОРУ ГАЗЭТЫ „ЗЬВЯЗДА“-МЕНСК, САВЕЦКАЯ, №63, 3ці ПАВЕРХ.
ПАРТРЭТЫ, ГРАВЮРЫ, ПЛЯНЫ, СХЭМЫ, ФАКСІМІЛЕ, ЭТЫКЭТЫ, ЦЭНЬНІКІ, ВОКЛАДКІ